Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцесь!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

АЦЬВЕР
8 кастрычніка 1931 г.
№ 233 (3322)

ПУБЛІЧНАЯ БІБЛІЯТЭКА СССР
І-б. "Савецкая Беларусь" Москва Моховая, 6 Публичной библиотеке СССР им. Ленина отд. обмен. адвін экз.

За масавы агляд работы саветаў

Саветы БССР праз некалькі дзён пачынаюць справаздачную кампанію. Шырокія рабоча-калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы будуць правяраць наколькі саветы выканалі іх наказы, наколькі органы пралетарскай дыктатуры перабудаваліся на новаму ў адпаведнасьці з задачамі сучаснага перыяду сацыялістычнага будаўніцтва. ЦВК БССР пастанавіў правесьці гэтую чарговую справаздачную кампанію саветаў у перыяд паміж 10 кастрычніка і 10 лістапада, разьбіўшы яе на два этапы: з 10 па 20 кастрычніка падрыхтоўчы, з 20 кастрычніка па 10 лістапада непасрэдна справаздачная кампанія.

Справаздачная кампанія саветаў у гэтым годзе набывае асабліва важнае палітычнае значэньне. Наша краіна з посьпехам закончыла трэці квартал 3-га рашаючага году пяцігодкі і ўступіла ў апошні завяршальны квартал. У лік дзейнічаючых фабрык і заводаў штодзень уступаюць новыя магутныя гіганты пяцігодкі, новыя цэхі, карпусы і аграгаты. Толькі некалькі дзён таму назад увесь СССР з энтузіязмам спаткаў вестку аб новай чарговай перамозе на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, аб пуску Харкаўскага трактарнага і Маскоўскага аўтамабільнага заводаў.

Цэлы рад галін народнай гаспадаркі 3 квартал і пачатак 4 кварталу азначылі выкананьнем сваіх пяцігадовых плянаў у 23¾ г. Сярод гэтых перадавых галін цяжкая і лёгкая індустрыі, ажыцьцяўляючых палітыку партыі «дагнаць і перагнаць», у ганаровы сьпіс змагароў за пяцігодку ўвайшла таксама наша швэйная прамысловасьць БССР.

Правільная ленінская палітыка нашай партыі забясьпечыла ня толькі перамогу на фронце індустрыялізацыі. Мы выходзім пераможцамі ва ўпартым бай за рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, за перабудову нашай краіны з адсталай аднаасобнай у перадавую калгасную. На 1-х БССР калектывізавана на 49,3 проц.

Калектыўныя гаспадаркі ўжо зараз пачалі паказваць свае вялікія гаспадарча-палітычныя перавагі. Мы зьяўляемся сьведкамі таго, як услед за пасьпяховым выкананьнем зярнёвай праблемы, ня менш пасьпяхова вырашаецца праблема жывёлагадоўлі.

На фоне гэтых гістарычных перамог і дасягненьняў сучасная справаздачная кампанія набывае асабліва значэньне.

Масавы агляд работы саветаў павінен перш за ўсё выявіць наколькі саветы перабудавалі сваю работу па новаму, асабліва масавую. Агляд павінен паказаць наколькі глыбока савецкі апарат упрыняў паказаньні тав. Сталіна, наколькі ўмела ён іх прыстасаваў у сваёй рабоце. Бязумоўныя дасягненьні сандуўніцтва заваёваны пры непасрэдным удзеле саветаў, аднак неабходна адзначыць, што ў радзе месц палітычная і гаспадарчая актыўнасьць мае перарасла асобныя саветы. Часамі нашы гарадзкія, местачковыя і сельскія саветы, патрабуючы работы на новаму, самі не перабудаваліся.

Масавы агляд, які зараз праводзіцца, павінен мабілізаваць увагу мас па двух асноўных кірунках: выкананьне праграмы 3 году пяцігодкі і перабудовы работы саміх саветаў для гэтага выкананьня. Баявая задача—ператварыць гарадзкія саветы ў органы, якія магчы-б з посьпехам кіраваць нашай рэспубліканскай і мясцовай прамысловасьцю. Ня можа быць двух думак аб тым, што той савет кепскі, які ня зможа выйсьці пераможцам у барацьбе за прамфінплян 4-га кварталу. Мы павінны дабіцца такога становішча, калі гарсаветы стануць сапраўднымі гаспадарамі гарадзкой гаспадаркі, калі яны ажыцьцёвяць рашэньне чэрвеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб гарадзкой і камунальнай гаспадарцы.

Гарадзкая гаспадарка і яе складнікоўя часткі дабрабыту і жылбудаўніцтва адыгрываюць не малую ролю ў пытаньні палепшаньня матар'яльна-бытавога становішча рабочай клясы. На працягу масавага агляду і справаздачнай кампаніі неабходна будзе завастрыць увагу ўсёй пралетарскай грамадзкасьці на ўдым гарадзкой гаспадаркі і ператварэньня нашых гарадоў у сапраўды сацыялістычныя гарады.

У барацьбе за баяздольнасьць і працаздольнасьць саветаў, вялікую ролю адыгрываюць сэкцыі і дэпутацкія групы на прадпрыемствах. Гэтыя апошнія зьвяны сыстэмы саветаў у большасьці месц працуюць дрэнна (Менск, Гомель і г. д.). У радзе месц дэпутацкія групы нават не набылі правоў грамадзянства на прадпрыемствах і не пачалі перабудоўваць сваёй работы.

Неабходна пакончыць з апартуністычнымі адносінамі да савецкай работы на прадпрыемствах.

Умацаваньне саветаў патрабуе ў першую чаргу асноўнай увагі да сельсавету. На гэтым участку мы маем больш усяго прарываў (Слуцкі, Бярэзінскі, Пыцярынскі і г. д.). Нашы сельсаветы, працуючыя ў складаных умовах, ажыцьцяўляючы непасрэдна клясавую палітыку пралетарскай дзяржавы на вёсцы, часта самі засьмечаны чужымі варожымі элемэнтамі. Трэба дабіцца ў працэсе агляду саветаў ачысткі іх ад клясава варожых элемэнтаў. Трэба рашуча перабудаваць сельсаветы, ператварыўшы іх у штабы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Сельсаветы павінны стаць баяздольнымі ў справе далейшага разгортваньня калгаснага руху ўшырыню і далейшага палепшаньня якасьці калгаснай вытворчасьці. Паказаньні тав. Сталіна, якія сталі праграмай дзеяньня і падважнікам для ўдыму калгаснай вытворчасьці — павінны быць сьцягам саветаў, ў калгасным руху.

Узьнімаючы масавую работу сельсавету трэба ўхапіцца за галоўнейшыя зьвены: сэкцыю, дэпутацкія групы, сац. выканаўцы і камісіі садзейнічаньня.

У арсэнале мэтадаў і форм масавай работы сельсаветы маюць шмат новага. Многія сельсаветы ў першай дэкадзе масавага агляду ўжо здолелі паказаць узоры баявой арганізацыі мас вакол справаздачнай кампаніі (Ельск, Быхаў, Капыль, Жлобін і г. д.). Творчая актыўнасьць калгасных мас вялікая. Неабходна ўмела пераключыць гэтую актыўнасьць на перабудову сельсаветаў.

Дні агляду і справаздачнай кампаніі саветы павінны мабілізаваць калгасныя масы на гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, на выкананьне праблемы сельскай гаспадаркі—жывёлагадоўлі. Трэба дабіцца поўнага выкананьня пляну сяўбы і зябу, плянаў загатовак і мабілізацыі сродкаў. Саветы павінны дапамагчы калгаснаму сэктару ў справе разьмеркаваньня ўраджаю і даходаў. Ліквідацыя абязьлічкі ў калгасе, укараненьне зьдзельшчыны і новыя прынцыпы аплаты працы—вось вузлавыя практычныя пытаньні масавай праверкі работы сельсаветаў.

Задачу сваю саветы здолеюць выканаць тады, калі яны сапраўды перабудуюць сваю работу, стануць гібкімі.

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі павінны разгарнуць шырокую работу вакол праверкі работы саветаў. Клясавы вораг будзе імкнуцца скарыстаць справаздачную кампанію у сваіх контрреволюцыйных мэтах. Рашучы адпор клясаваму ворагу, бязлітасная барацьба з апартуністычнай стаўкай на самацёк, па-баявому, па-бальшавіцку правядзем агляд работы саветаў.

Паніка на Фінляндзкай біржы

ГЕЛЬСІНГФОРС, 6-X. Урад забараніў вываз фінляндзкай валюты за граніцу. Газэты паведамляюць аб узьніклай за апошні час паніцы на валютным рынку, аб пашчным продажу фінляндзкай маркі і адначасовай пагоні за далярам, які ўчора на чорнай біржы катыраваўся на 23 проц. вышэй афіцыйнага курсу.

Паніка ў Даніі

СТАКГОЛЬМ. 6-X. У Даніі пачалася панічнае вываз капіталу насельніцтвам укладаў з банкаў у першую чаргу з кі банк з балянсам у 500 мільёнаў крон «Хандэльсбанку». Гэты буйнейшы дан знаходзіцца з прычыны гэтага на мяжы краху. Валюты савет парляменту вынес рашэньне, па якім залатое забясьпечаньне дзяржбанку зьніжаецца з 50 да 33 проц.

Курс дзяржаўных аблігацый Скандынаўскіх краін зноў моцна зьнізіўся ў Нью-Ёрку.

Напружанае сытуацыя на амэрыканскім храшовым рынку

НЬЮ-ЁРК. Курсы акцый важнейшых прадпрыемстваў трэсту зьнізіліся. Цэны на тавары зьменшыліся. Панічны настрой знайшоў свой адбітак у артыкуле «Івінг пост», якая ў рэзкім тоне абвінавачвае Англію ў анты-амэрыканскай прапагандзе і ў распаўсюджваньні чуткаў аб недыходзячым філіпсавым краху ў Амэрыцы.

Чарговы крах банку

БЭРЛІН. 6-X. Сёньня спыніў плацяжы Дрэздэнскі банк «Фольксбанк», заснаваны ў 1891 г. Прычынай краху банку зьяўляецца масавае выняцце ўкладаў.

„Бура крызісу зьмяце капіталістычны сьвет

ВЕНА. 2-X. З Бухарэсту паведамляюць, што на паседжаньні міжпарляманцкай уніі выступіў з вялікай прамовай старшыня нямецкага рэйхстагу, сацыял-дэмакрат Лебэ, які заявіў, што найбольш рацыянальным вырашэньнем гаспадарчага крызісу зьявіўся-б мытны саюз паміж Францыяй і Нямеччынай, прычым ён зрабіўся-б выходным пунктам для эканамічнага пан-эўрапэйскага саюзу.

Вітаючы наведваньне французкім міністрам Бэрліну, Лебэ заявіў, што калі ня будзе ажыцьцёўлена вырашэньне эканамічнага крызісу ў Эўропе, дык «бура крызісу зьмяце праз увесь сьвет».

Польскія імпэрыялісты пагражаюць

ВАРШАВА. 5-X. Польскі друк спаткаў выбухам абурэньня «антыпольска га мерапрыемства» латвійскага ўраду, якія, як вядома, заключаюцца ў тым, што латвійская пракуратура закрыла рад польскіх арганізацый у Латвіі і польскую газэту ў Дзьвінску па абвінавачаньні ў калёнізатарскай дзейнасьці.

«Кур'ер Чырвоны» патрабуе «праву чыць» Латвію.

Далейшы развал капіталізму

Масавыя банкруцтвы старэйшых банкаў ахапілі ўвесь капіталістычны сьвет

Акупацыйнае войска Японіі атрымлівае новую дапамогу

ТОКІЕ. 6-X. Японскі ўрад пераняў паслаць у бліжэйшыя дні ў Шанхай транспарт «Токіза» з 400 салдатамі морскай пяхоты, матывуючы гэтае рашэньне узмацненьнем антыяпонскага блёку. 300 салдат з Шанхаю будуць адпраўлены ў Ханькоў. Сёньня сакрэтар міністраў пераняў у выпадку патрэбы эвакуяваць японскіх разыдэнтаў, якія пражываюць у частках Янцзы, Ханькоу і Шанхай.

Ультыматыўныя ноты Японіі нанкінскаму ўраду

ТОКІЕ. 61-X Агэнцтва Сімбун Рэнто паведамляе, што японскі ўрад прапанаваў міністру замежных спраў Сэдэхаро ў ноце пратэсту на імя нанкінскага ўраду зьвярнуць увагу Нанкіну на астуцныя моманты: па-першае, сучасны антыяпонскі рух у Кітаю вядзе да разрыву дыпляматычных зносін з Японіяй. Па-другое, нанкінскі ўрад павінен больш строга кантраляваць антыяпонскую агітацыю. Па-трэцяе, у выпадку, калі Нанкінскі ўрад па-ранейшаму будзе ўхіляцца ад кантролю над антыяпонскім рухам або ж будуць падахвочваць яго японскія разыдэнты, падпадуць пад вялікую пагрозу і Японія прымушана будзе зьвярнуцца да актыўных мер абароны японскіх разыдэнтаў у Кітаі.

Гавань зусім замерла

БЭРЛІН. 6-X. Забастоўка маракоў Данцыгу працягваецца. Гавань зусім замерла. З Брэмэну паведамляюць, што там пачалася частковая забастоўка маракоў. Маракі 3-х параходаў кінулі работу. У Гамбургу частковая забастоўка маракоў пашырылася. Забастоўка адбываецца на 15 параходах.

Абураныя рабочыя забаронай „Ротэ Фанэ" павыбівалі шыбы фашыскага выдавецтва

БЭРЛІН. 6-X. Сёньня ў ночы ў Бэрліне невядомымі асобамі разьбіты шыбы ў 21 аддзяленьні буйнейшага выдавецтва Ульштэйна. Некаторыя буржуазныя газэты скарыстоўваюць гэты выпадак для ўзьдзеяньня кампаніі супроць кампартыі, сьцьвярджаючы, што напад нібы-та, быў арганізаваны камуністамі і што каменьні, якімі разьбіваліся шыбы нібы-та былі завернуты ў паперу, на якой знаходзіўся надпіс: «Далоў забарону «Ротэ Фанэ».

У пошуках кандыдата ў міністры

БЭРЛІН. 6-X. Наконт кандыдатур на аслабнёньня міністэрскія пасты, у габінэце Брюнінга да гэтага часу нічога невядома. Газэты паведамляюць, што Брюнінг прапанаваў партфэль міністра народнае гаспадаркі прафэсару Вармболь, а партфэль міністра шляхоў зносін—вядомаму прамыслоўцу, генэральнаму дырэктару І. Г. Фарбэн Індустрыі Шмітцу. Аднак, абодвы нібыта адмовіліся ўвайсьці ў габінэт. Кандыдатам ў міністры ўнутраных спраў газэты называюць былога вайсковага міністра Гесьлера.

Усё гэта пакуль што абгрунтаваньня на чутках камбінацыі. Што датычыцца міністра замежных спраў, дык у палітычных колах усё больш пэўна заяўляюць, што або сам Брюнінг будзе часова кіраваць гэтым міністэрствам або міністрам замежных спраў будзе назначан нямецкі пасол ў Лёндане Нэйрат.

Гульня ў „незалежнасьць" або замацаваньне японскіх імпэрыялістаў у Манчжурыі

ТОКІЕ. 5-X. Учора камандуючы японскай арміяй у Манчжурыі апублікаваў дэкларацыю, у якой заначае, што «ніводная краіна ня можа весьці перагаворы з былым урадам 4-х ; сходніх правінцый, якому падначалены недысцыплінаваныя і пазбаўленыя кіраўніцтва войска».

У дэкларацыі гаворыцца далей, што ініцыятары ўзьнікшага руху на карысьць «незалежнасьці», а таксама насельніцтва любіць японскае войска, няма адзнакі таго, што «мы жадаюць аднаўленьня старога рэжыму.

Пасьля слоў дэкларацыі, японскія войска, ўстрымаюцца ад умяшацельства ў рухах, аднак, не дапусьцяць арганізацыі змовы з мэтай стварэньня палітычнай ўлады старым Мукдэнам, дзе парадак падтрымліваецца японскім войскам».

Учора-ж Хонсіё апублікаваў адозву да насельніцтва, у якой заяўляе, што «старая Мукдэнская ўлада прыгнечвала насельніцтва і парушала правы Японіі». Хонсіё заклікае насельніцтва зьвярнуцца да штодзённых заняткаў.

Забастоўчны рух маракоў пашыраецца

БЭРЛІН. 6-X. Забастоўка партовых рабочых у Данцыгу працягваецца ўпарта. У гавані работа цалкам спынена. Рабочыя, члены рэфармісцкіх і хрысьціянскіх прафсаюзаў змагаюцца ў цесным адзіным фронце з рэвалюцыйнымі партыямі. Сацыял-дэмакраты і хрысьціянскія рабочыя падпарадкаваліся кіраўніцтву чырвонага саюзу адзінства.

Забастоўка маракоў у Гамбургу на працягу ўчарашняга дня пашырылася. Дагэтуль на 15-ці суднах прыпынена работа. У Гамбургу праводзіцца таксама частковая забастоўка партовых рабочых, супроць якой мабілізаваны ўвесь апарат рэфармісцкай прафбюра кратыі, паліцыі і баявога атраду «рэйхсбанэру».

Арыштаваны італійскія партовыя рабочыя, якія падазраюцца ў прыналежнасьці да стачачнага кіраўніцтва.

Забастоўчны рух распаўсюджваецца таксама на Брэменскую гавань, дзе маракі параходаў «Астарта», «Нордлянд» і «Ольбэрс» адказгодна кінулі работу.

Масавы пераход у рады рэвалюцыйнага прафсаюзу

БЭРЛІН. 6-X. Паводле паведамленьня з Данцыгу, стачка партовых рабочых працягваецца з ранейшай згрупаванасьцю, ня гледзячы на нячуваны паліцэйскі тэрор. Усе ў большым ліку рабочыя ларываюць з рэфармісцкімі і сьляпскімі прафсаюзнымі правадырамі і пераходзяць у рады рэвалюцыйнага прафсаюзу.

У сац. дэмакратычнай партыі і сац. дэмакратычным саюзе «Шуцбунд» адбываюцца бурныя разгалосьсі. У партыі стварылася вялізарная пробка. Непагружаныя тавары накапляюцца і прадпрыемцы цярпяць штодня вялізарныя страты.

БЭРЛІН. 5-X. Адстаўка Курцыуса (член народнай партыі) адбылася пад націскам правых партый, да якіх далучылася таксама народная партыя, якая знаходзіцца ва ўрадавым блёку.

Растуць і мацнеюць рады кампартыі

ЛЕНДАН. 2-X. У Бельбасе (Ірляндыя) пад кіраўніцтвам мясцовай камуністычнай арганізацыі і камітэтаў бес працоўных адбылася буйная дэманстрацыя наконт салідарнасьці з маракамі англійскага флёту, адбываліся жорсткія сутычкі паміж дэманстрантамі і паліцэйскімі. 10 бельбаскіх рабочых падалі заявы аб уступленьні ў кампартыю

Пленум ЦК МОПР

МАСКВА. 7-X. 6 кастрычніка закончыў свае работы другі пашыраны пленум ЦК МОПР СССР 3-га скліканьня. Мопрабскія арганізацыі ва ўсім сьвеце налічваюць 4.628.000 членаў, ні лічачы СССР. За апошнія месяцы ўзьнікілі новыя мопрабскія арганізацыі. З усіх 66 сэкцый МОПР больш паловы знаходзяцца на нелегальным становішчы і змушаны працаваць на ўмовах глыбачэзнага падполья.

У СССР за час з 1-га студзеня 1931 году колькасьць членаў МОПР павялічылася на 2.000.000 чалавек і дасягнула 7.500.000. За 6 месяцаў узьнікілі тысячы новых ячэек МОПР.

У прымаемых рашэньнях пленум ЦК МОПР згрупаваў асаблівую ўвагу на задачах мопрабскіх арганізацый у галіне паглыбленьня вымеру інтэрнацыянальна-выхаваўчай работы, і ў галіне непасрэднага ўдзелу ў сацыялістычнай будоўлі. Трэба дамагчыся шырачэйшай сьвядомасьці працоўных мас СССР аб штодзённай барацьбе рабочае клясы за рубяжом. Умацаваньне інтэрнацыянальнай сувязі з арганізацыямі за межай, разьвіцьцё шэфства над палітвязьнямі, шырокая пастаноўка выхаваўчай работы сярод рабочых СССР і сярод дзяцей—гэтыя паасобныя формы работы мопрабскіх арганізацый.

Асабліва важна ўзмацніць інтэрнацыянальнае выхаваньне маладых пляны экспэдыцыі, «уцікамёрваньне» Заходняй Украіны, катаваньні і зьдзекі над арыштаванымі і г. д.) На працягу бліжэйшых двух дэкад на буйнейшых прадпрыемствах, фабрыках, заводах, калгасах і г. д. павінны быць праведзены мітынгі пратэсту супроць фашысцкага тэрору ў Польшчы.

Назначэньні

СНК СССР пастанавіў вызваліць т. т. Палуяна, Палюдава, Рутковскага, Спундэ, Падшываліна, Сыінега, Арнольдава ад абавязкаў членаў калегіі Наркам Шляхоў Зносін.

Прэзыдыум ЦВК СССР зацьвердзіў першым нам. наркома тав. Міронава Янку Нікіціча і другім нам. наркома Шляхоў Зносін тав. Благаравава Георгія Янкава і нам. наркома шляхоў зносін тав. тав. Шушкова Пётру Сяргеевіча, Булата Янку Лазаравіча.

Прэзыдыум ЦВК СССР пастанавіў вызваліць тт. Постнікава і Квірынга ад абавязкаў намесьнікаў народнага камісару Шляхоў Зносін.

Ліквідаваць разрыў паміж малацьбой, расьцілам і мочкай лёну і канапель

У найкарацейшы тэрмін закончыць уборку канапель

Узмацніць апрацоўку тэхнічных культур

Апрацоўка тэхнічных культур і ўборка канапель разгортваецца вельмі марудна. Паводле вестак НКЗ да 30-е верасьня, абмалот лёну выканан на 93, 7 проц., расьціл і замочка—90,8 проц.

На Стара-Дароскім раёне абмалот выкананы на 65,2 проц., Уваравіцкім—58 проц., Бягомльскім—45,4 проц., Плешчаніцкім—71,4 проц., Чашніцкім—73,7 Сенненскім—84,4 проц.

План уборкі канапель выкананы толькі на 64,3 проц., трэба ўбраць яшчэ каля 12.000 га. канапель. Адстаюць па ўборцы канапель: Лоеўскі раён,—які выканаў 59,1 проц., Лельчацкі—56-9 проц., Нараўлянскі—47,4 проц., Парыцкі—18,1 проц., Церахаўскі—25,2 проц., Чырвона-слабодзкі—41,4 проц., Уваравіцкі 7,8 проц., Барысаўскі—15,5 проц., Клімавіцкі—31,5 проц., Менскі—8,1 Сураскі—27,1 проц., Чашніцкі—41,4 про

Даць машыны і абсталяваньне

Будаўніцтва Вушацкага лёназаводу тармозіцца. Будаўнічыя работы выкананы на 80-85 проц., можна было-б прыступіць да мантажу, але да апошняга часу не трыманы яшчэ патрэбныя машыны, абсталяваньне.

Барысаўскія торфараспрацоўкі павінны даць заводу лёкамабіль, але пакуль што ён ня прывезены. Таксама не атрыманы яшчэ мялка, кудзельмашыны, не хапае казальскага інструмэнту.

Галавацяпы з лёнаканапляводбуду прыслалі 2 месяцы таму назад машыніста, калі будаўніцтва было выкананае на 30 проц, якому і зараз няма чаго рабіць.

Лёнаканапляводбуд павінен ужыць рашучыя захады, каб забясьпечыць Вушацкі лёназавод усімі патрэбнымі машынамі.

І. Брум.

Лён гніе на полі

ДУБРОЎНА. (Белта). Па некаторых калгасах раёну выцераблены лён ляжыць у снопах ня ўбраны. У калгасе «13-ы Кастрычнік» і «Зьвязда», Бельскага сельсавету, частка лёну згніла на полі. Грамадзкасьць калгасаў не мабілізавана на правядзеньне першапачатковай апрацоўкі лёну.

Глускі раён пляцецца ў хвасьце

Першапачатковая апрацоўка лёну і канапель па Глускім раёне знаходзіцца пад пагрозай эрыву. Раённыя арганізацыі недастаткова кіруюць гэтай кампаніяй. Няма сталага вучоту сушылак, мялак, нават невядома колькі лёну знаходзіцца ў калгасах, колькі ў аднаасобным сэктары.

У калгасе «Камуніст» 2 га лёну яшчэ стаіць на полі ў кучках і гніе пад дажджом.

Партячэйка і праўленьне калгасу ня цікавяцца апрацоўкай лёну. Старшыня сельсавету Герман таксама мала дбае аб гэтым. Старшыня сельсавету мае сувязь з кулакамі Шардыко Адамам, Васілеўскімі, Ісаевай, канфрабандыстам Млелыгіным Іаанам. Гэта хэўра агітуе, што «лён трэба мачыць, калі пачнецца замаразкі і пойдзе сьнег».

У аддаленьні калгасу «Камуніст» у в. Гэродзінчы апрацоўка лёну таксама ня скончана.

У калгасе «Чырвоны шлях», Макавіцкага сельсавету, сушылкі не адрамантаваны, да апрацоўкі лёну, канапель ня прыступлена.

Па Сіманоўскім, Карпілаўскім сельсаветах апрацоўка лёну таксама ідзе марудна.

У саўгасе Завалочыцы апрацоўка лёну зусім не пачата.

З прычыны апартуністычнага кіраўніцтва райза, райкалгассаюзу, апрацоўка лёну і канапель па Глускім раёне зрываецца.

Апроч таго, кулацкая частка па ўсім раёне не атрымала яшчэ цьвёрдых заданьняў па лёне. Аднаасобны сэктар не пачаў здаваць лішкі дзяржаве.

РК КП(б) неабходна ўжыць рашучыя захады, каб па ўдарнаму арганізаваць апрацоўку лёну і канапель.

Бальшавік.

Чаму адкладаюць апрацоўку лёну на зіму?

Калгасы Нова-Максімавіцкага сельсавету, Клічаўскага раёну, апрацоўку лёну адкладаюць на зіму. Кіраўніцтва некаторых калгасаў спасылаецца на тое, што трэба выбіраць бульбу. «Лён будзем апрацоўваць тады, як выкапаем бульбу». Так заяўляюць старшыні калгасаў: У калгасе «Чырвоны Маяк» яшчэ няскончан расьціл лёну. У гэтым-жа калгасе падняты лён у ліку 9 вазоў гніе на гумне пад дажджом, у радзе калгасаў лён пералежваецца, у выніку чаго паясуецца далакно, што наглядаецца ў калгасах «Чырвоны Маяк», «Савецкая Беларусь» і «Ст. Максімавічы».

Клічаўскі Райкалгасаюз павінен мабілізаваць калгасныя масы на тэрміновую апрацоўку лёну. Не дапусьціць псаваньня валакна. Разьслаць, падняць і апрацаваць лён у тэрмін.

Рубашны.

Фарсаваць апрацоўку лёну, раўнаючыся па перадавых

Бабруйск. (Белта). На 1-е кастрычніка па калгасах Бабруйскага раёну абмалочана 95 проц. выцерэбленага лёну, разаслана 56 проц., замочана 35,4 проц.

У калгасе «Чырвоны працаўнік», Харлапавіцкага сельсавету, да гэтага часу стаіць на полі ў кучках 6 га выцерабленага лёну Калгас ня прымае мер да апрацоўкі лёну.

Калгасы «Новы сьвет», Бярэсьняўскага с.-с., «Чырвоны кастрычнік», Броскага с.-с., імя Варашылава № 2» і Першага мая» № 3, Хімаўскага с.-с., пачалі мяць лён. Калгасы дабіліся гэтых посьпехаў, дзякуючы правільнай арганізацыі працы на аснове зьдзельшчыны.

Зрылі дзяржаве 1000 кгр. семя

Калгас «Вольная Беларусь», Слуцкага раёну, сёлета ўпяршыню зсеяў 5,25 га лёну. План сяўбы перавыкананы на 2,5 га.

Для калгасу гэта культура была зусім новай (калгас «Вольная Беларусь», зьяўляецца інтэрнацыянальным, у якім большая частка калгаснікаў яўрэі, не знаёмыя з працэсамі апрацоўкі лёну), аднак, ня гледзячы на гэта цераблення і расьціл былі праведзены своячасова.

Увесь лён ужо абмалочан і здана дзяржаве 1000 кл. семя.

Калгаснікі абяцаюць, што далейшая апрацоўка лёну таксама будзе праведзена па-ўдарнаму.

Г. Мазо.

Пачалася масавая падрыхтоўка да „Дню ўраджаю і калектывізацыі"

ДУБРОЎНА. (Белта). У раёне пачалася масавая падрыхтоўка да правядзеньня «Дню ўраджаю і калектывізацыі».

Для дэманстрацыі посьпехаў працы саўгасаў і калгасаў у раёне арганізуюцца дзве сельска-гаспадарчыя выстаўкі. Зараз прыступілі да будаўніцтва выставачнага памяшканьня.

РВК адпусьціў 3 тысячы рублёў для прэміяваньня лепшых калгасаў і саўгасаў.

Адстае аднаасобны сэктар

ДУБРОЎНА. (Белта). План азімых па ўсім раёне на 1-га кастрычніка выкананы толькі на 86 проц. Вельмі адстае аднаасобны сэктар. У ім план асеньняй сяўбы выкананы толькі на 81,7 пр.

Першымі на сяўбе ідуць саўгасы, яны перавыканалі план сяўбы. Замест вызначаных да засеву 308 га. засеяна 329 га.

Калгасамі план сяўбы выкананы на 88 проц.

Зяблева праходзіць вельмі слаба, з мест вызначаных 22.000 га, на 1-X узьнята толькі 2.124 га, альбо 9,6 пр. пляну.

Прывітаньне энтузіястам пяцігодкі

Тэлеграма тав. ГЕЯ.

Выканаць паказаньні тав. Сталіна

Вітаю рабочых і гаспадарнікаў швэйнай прамысловасьці Беларусі, выканаўшых пяцігодку ў тры гады.

Заклікаю накіраваць усе намаганьні да чоткага выкананьня паказаньняў т. Сталіна, перавыкананьня плянаў 4 кварталу.

ГЕЙ.

Умацоўвайце дасягнутыя тэмпы

Дзяржшвэйпром горача вітае выкананьне швэйнікамі Беларусі пяцігодкі ў тры гады, дасягнутае пад кіраўніцтвам кампартыі, шляхам шырокага ўдзелу ўсёй грамадзкасьці і энтузіязму рабочых мас.

Надалей замацоўвайце дасягнутыя вамі тэмпы, працягвайце барацьбу за павышэньне якасьці за ўдзеньне гаспадарчага разьліку.

Дзяржшвэйпром ІВАНОВА.

Да пленуму ЦК КП(б)Б

Уключыцца ў дэкаднік праверкі

перабудовы работы партыйных і камсамольскіх арганізацый на транспарце

Ініцыятары дэкадніка—Аршанскі РК КП(б)Б—выклікаюць Гомель, Віцебск, Жлобін

Аршанскі райком КП(б)Б рыхтуецца да пленуму ЦК КП(б)Б

Дэкаднік праверкі на транспарце

ВОРША. 6-X. Для распрацоўкі пытання аб чыгуначным транспарце на надыходзячым пленуме ЦК КП(б)Б, бюро Аршанскага райкома КП(б)Б з 5-га кастрычніка абвясьціла дэкаднік праверкі перабудовы працы партыйных і камсамольскіх арганізацый вузла ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі і яго падрыхтованасьці да асеньня-зімовых перавозак.

Пад кіраўніцтвам агіт-масавага райкому створана пяцёрка. У агляд уцягваюцца рабочыя брыгады з ударнікаў.

Бюро РК КП(б)Б выклікае на сацспаборніцтва па лепшым правядзеньню агляду і падрыхтоўцы матар'ялаў да пленуму ЦК КП(б)Б. **Гомельскі, Віцебскі і Жлобінскі гаркомы.** (Белта).



Пра ход будаўніцтва Гомельскага порта

Пастанова Камісіі Выкананьня пры Савеце Народных Камісараў БССР

Заслухаўшы даклады начальніка Гомельскага портбуду т. Малярэнка і сакладклад прадстаўніка НК РСІ БССР т. Вялічка аб ходзе будаўніцтва Гомельскага порта, камісія Выкананьня пры СНК БССР устанаўляе; што ў сучасны момант аб'ём і тэмпы будаўніцтва порта ў асноўным выпраўлены і нават на некаторых вучастках ёсьць перавыкананьне плянавых заданьняў.

Але ёсьць яшчэ і недахопы, якія тармозяць правядзеньне мерапрыемстваў па фарсаваньні пачатых пабудоў і падрыхтоўчых работ на пасобных вучастках:

а) няма зацьверджаных праектаў па дэталях некаторых аб'ектаў будаўніцтва; б) марудна выконваюцца хлебабудам работы, зьвязаныя з будаўніцтвам, чым затрымліваецца выкананьне работ па прычальнай лініі; в) мэханізмы—паравыя бабы і транспарцёры загружаны ня поўнасьцю, ёсьць значныя простоі; г) дрэнна забясьпечваецца порт—будаўніцтва рабочай сілы, асабліва мастоўчыкамі і ў гэтым кірунку Гомельскі аддзел кадраў бязьдзейнічае, а таксама кіраўніцтва портбуду недастаткова ўжывае захады да арганізаванага набору рабочай сілы праз заключэньне дагавораў з калгасамі; д) Гомельскім гарадзкім саветам ня прыведзены ў належны парадак гарадзкія спускі да порта.

Выходзячы з гэтага, камісія Выкананьня пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Прасіць Народны Камісарыят Воднага транспарту забясьпечыць будаўніцтва Гомельскага порта канчаткова—зацьверджанымі праектамі дэталяў адпаведных аб'ектаў.

Даручыць Начальніку Гомельскага портбуду т. Малярэнка падаць Народнаму Камісарыяту Воднага транспарта даклад па гэтым пытаньні.

2. Прапанаваць Начальніку Элеватарнага будаўніцтва т. Столяраву на пазьней як праз дэкаду закончыць работы на тэрыторыі ля тарнага складу, якія затрымліваюць будаўніцтва порта.

3. Прапанаваць Начальніку Гомельскага порту т. Малярэнка на працягу трох дзён дабіцца поўнай загрузкі мэханізмаў праз вынішчэньне абязьлічанага абслугоўваньня, упарадкаваньне тэхнічнага падліку і ўзмацненьне тэхнічнага нагляду.

4. Прапанаваць Гомельскаму аддзелу кадраў, пад адказнасьць загадчыка, у дэкадны тэрмін забясьпечыць будаўніцтва порта патрэбнай колькасьцю рабочых—мастаўчыкоў.

Даручыць Начальніку Гомельскага порта т. Малярэнка зараз-жа заключыць дагавор з калгасамі на вярбоўку нехапаючай рабочай сілы.

5. Катэгарычна прапанаваць старшыні Гомельскага Гарадзкога Савету неадкладна забясьпечыць прывядзеньне ў належны прадак гарадзкіх спускаў да порта.

6. Прапанаваць Белдзяржснабу, пад адказнасьць т. Каца, у дэкадны тэрмін забясьпечыць будаўніцтва Гомельскага портбуду патрэбным асартыментам жалеза, а таксама спэцвопраткай і ботамі.

7. Прасіць Народны Камісарыят Воднага Транспарту ўжыць канчатковыя захады для забесьпячэньня будаўніцтва Гомельскага порта каменьнем, спынць у гэтай справе абязьлічку і прыцягнуць да суровай адказнасьці вінаватых у зрыве дастаўкі каменьня.

8. Прасіць Гомельскі гарадзкі прафсавет зьвярнуць увагу на неабходнасьць ўзмацненьня работы праф. ячэйкі на портбудаўніцтве асабліва ў галіне разгортваньня сацыялістычных мэтадаў працы і правядзеньня барацьбы з цяжкасьцю рабочай сілы.

Нам. старшыні камісіі выкананьня пры СНК БССР **А. Калнін.**

Вык. аб. сакратара камісіі выкананьня пры СНК БССР **Л. Дубавіцкі.**

6-га кастрычніка 1931 г.

г. Менск.

Абвяшчаецца трохмесячнік барацьбы за эканомію паліва

Прэзыдыум ЦКК УсеКП(б) і калегія НК-РСІ СССР—аб эканоміі паліва ў чацьвёртым квартале

Прэзыдыум ЦКК УсеКП(б) і калегія НК-РСІ прынялі пастанову аб эканоміі паліва. У гэтай пастанове вызначаецца недастатковая ўвага гаспадарчых, прафэсыянальных і партыйных арганізацый да пытаньня эканоміі паліва. Рабочыя масы не мабілізаваны арганізацыямі вакол гэтай штодзённай задачы.

«Цалкам падтрымліваючы ініцыятыву рабочых і спэцыялістаў заводаў «Серп і молот» і «Красный Путиловец»,—гаворыцца ў пастанове,—прэзыдыум ЦКК УсеКП(б) і калегія НК-РСІ СССР прапануюць:

Правесьці ў прамысловасьці, на транспарце, ў камунальнай гаспадарцы трохмесячнік барацьбы за эканомію паліва і рацыяналізацыю паліваскарыстаньня з тым, каб дамагчыся ў чацьвертым квартале ня менш 10 проц. эканоміі паліва ад устаноўленых для гэтага кварталу ўдзельных норм спажываньня паліва (на адзінку прадукцыі ў прампрадпрыемствах, на 1 км-кілёмэтр прабегу на транспарце).

Галоўнымі практычнымі задачамі ў барацьбе за эканомію паліва павінны быць:

а) Устанаўленьне норм расходу паліва ў строгай адпаведнасьці з вытворчымі працэсамі. Давядзеньне гэтых норм да цэху і агрэгату. Сталы вучот выдаткаваньня паліва.

б) Упарадчаньне цёпла-сілавой гаспадаркі і абсталяваньне сілавой і цеплавой сетак. Устаноўленьне жорсткіх норм ў вучот выдаткаваньня пары і энэргіі на вытворчыя працэсы. Складаньне плянаў і правядзеньне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў па эканоміі паліва і энэргіі.

в) Такая арганізацыя працы ў цёпла-сілавой гаспадарцы, якая пакончыла б з абязьлічкай зьнішчыла б ураўніловку ў аплаце. Падвышэньне кваліфікацыі і перапрыхтоўка малодшага і сярэдняга тэхнэрсаставу (качагары, машыністы, мацёры і г. д.).

г) Укараненьне і правядзеньне сапраўднага гаспадарчага разьліку ў энэрга-цэхах.

д) Мабілізацыя ўнутраных энэргарэсурсаў і адбросавага паліва (абрэзкі, пілавіньне і г. д.). Шырокае скарыстаньне мясцовых відаў паліва.

е) Упарадчаньне складаў паліва (базісных і выдатковых). Правільныя і бярэжлівыя адносіны да хаваньня паліва.

Адказнасьць за гэту работу ўскласьці на дырэктара прадпрыемстваў і яго намесьніка. Пад яго старшынствам для кіраўніцтва і правядзеньня трохмесячніка эканоміі паліва стварыць на кожным прадпрыемстве ў раёне і на вучастку чыгункі брыгаду з прадстаўнікоў мясцовай партыйнай і прафсаюзнай арганізацый, старшыні заводскай КК-РСІ (або групы саздзейнічаньня РСІ), старшыні, энэргаячэйкі, сакратара ячэйкі УсеЛКСМ і старшыні ІТР. Гэта брыгада працуе, абапіраючыся на заводзкія цэхавыя энэргаячэйкі пры бліжэйшым удзеле вытворчых нарад і камісій; рэгулярна асьвятляе сваю работу ў друку, устанавіўшы дакладны падзённы вучот дасягаемай эканоміі паліва.

Трохмесячнік павінен даць ня толькі матар'яльную эканомію, але і поўную праверку выкананьня пастановы партыі і ўраду па рацыяналізацыі цёпла-сілавой і энэргетычнай гаспадаркі на прадпрыемстве, дэпо і г. д.».

Для кіраўніцтва трохмесячнікам эканоміі паліва, пры прэзыдыуме ЦКК УсеКП(б) і калегіі НК-РСІ СССР створана цэнтральная камісія ў складзе таварышоў: Крынцкага (старшыня), Ломава, Чумічава (ВСНГ СССР), Шапіра, Аяксуткіна (ЦКК РСІ), Сэгаля (УсеЦСПС), Шэмятоўскага (Дзяржплян СССР), Пронина (ЦК УсеЛКСМ), Кузьміна («Экономическая жизнь») і Воравава («За индустриализацию»). НК-РСІ рэспублік, абласным, краёвым і раённым КК-РСІ запрапанавана стварыць у сябе аналягічныя камісіі.

У гонар 14-й гадавіны Кастрычніка

па-бальшавіцку выканаем плян асеньня-зімовых перавозак

Рэпарт грузчыкаў першай скразной брыгады Гомельскай прыстані

Улічваючы тую вялізарную ролю, якую грае водны транспарт ва ўсім нашым сацыялістычным будаўніцтве, асабліва ў часе асеньніх перавозак, мы, грузчыкі першай скразной брыгады Гомельскай прыстані заяўляем, што пастаўленыя перад намі партыяй і ўрадам задачы—выканаць і перавыканаць прамфінплян—будуць выкананы.

Плян за верасень намі перавыкананы. Па заданьні кожны грузчык павінен быў даць штодзень 7 тон нагрузкі, а даў 7,5 тон. Мы дабіліся свячасовага і 100 процантнага выхаду на працу. Лепшыя ўдарнікі брыгады ў колькасьці 7 асоб падалі калектыўную заяву аб уступленьні ў рады Ленінскай партыі.

Праўда, у нас ёсьць прарывы. Напрыклад, саюзам не ахоплена 30 проц. рабочых. Мабілізацыя ўнутраных сродкаў праведзена на 80 проц. Яшчэ няпоўнасьцю ліквідаваны няпісьменнасьць і малапісьменнасьць. Культурна-выхаваўчая праца амаль зусім не праводзілася.

Мы абяцаем да 14 гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі зьнішчыць існуючыя ў брыгадзе прарывы, разгарнуць яшчэ больш напружаныя тэмпы, каб забясьпечыць поўнае выкананьне і перавыкананьне трамфінпляну, якім ня было ніводнага прагулу, ніводнага адмаўленьня ад працы, каб ня было ніводнага прастою параходаў. Дабіцца 100 проц. ўступленьня рабочых у саюз. Узмацніць культурна-масавую працу. Ліквідаваць няпісьменнасьць і малапісьменнасьць. Вытворчыя нарады брыгады склікаць кожную пяцідзённку.

Мы замацоўваем сябе на працы ня толькі да канца пяцігодкі. Адміністрацыя, з свайго боку, павінна забясьпечыць нас усім неабходным інвэнтаром (насілкі, тачкі, ламы, канаты, шуфлі і г. д.) і свячасова падаваць яго.

Выклікаем пайсьці па нашым прыкладзе ўсе брыгады грузчыкаў прыстані Гомель, а таксама Бабруйскую, Барысаўскую і Магілеўскую прыстані нашага басэйну.

Віцебск, Гомель, Жлобін,

адкажэце на заклік Аршанскага РК КП(б)Б

Аршанскі райком КП(б)Б пастанавіў з 5-га па 15-та кастрычніка правесьці дэкаднік праверкі і самаправеркі работы партыйнай і камсамольскай арганізацыі Аршанскага чыгуначнага вузла.

Гэты дэкаднік, абвешчаны ў сувязі з набліжэньнем чарговага пленуму ЦК КП(б)Б, на якім будзе стаяць пытаньне аб рабоце чыгуначнага транспарту.

Мэта дэкадніка—выявіць, наколькі партыйныя і камсамольскія арганізацыі Аршанскага вузла выконвалі дырэктывы партыі аб сацыялістычным транспарце, па замацаваньні спаранай язды, ліквідацыі абязьлічкі, перавозе ўсіх зьвеньняў на гаспадарчы разрахунак, якасьці рамонту паравозна-ага і вагоннага паркаў; наколькі яны перабудавалі сваю работу ў адпаведнасьці з апошняй прамовай тав. Сталіна; наколькі яны пасьпяхова спраўляюцца з асеньня-зімовымі перавозкамі 3-га рашаючага году пяцігодкі і г. д.

Дэкаднік праверкі і самаправеркі таксама ставіць сваёй мэтай вылавіць і паказаць лепшыя партыйныя і камсамольскія ячэйкі чыгуначнага транспарту, паасобных партыйцаў і энтузіястаў ударнікаў, якія па-бальшавіцку змагаюцца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, як у якасных, так і ў колькасных адносінах.

У час дэкадніка ўся работа будзе праводзіцца пад кутком погляду поўнай ліквідацыі недахопаў і прарываў, якія маюцца ў рабоце партыйных і камсамольскіх арганізацый чыгуначнага транспарту.

Для правядзеньня дэкадніка пры райкоме КП(б)Б створана пяцёрка з прадстаўнікоў райкому РК ЛКСМБ, парткалектыву цягі чыгуначнага вузла рэдакцыі газэты «Ленінскі Прызыў» і райпрафсавету.

Неабходна зараз-жа арганізаваць ударныя брыгады друку з лепшых ударнікаў партыйцаў і камсамольцаў для праверкі работы чыгуначнай партыйнай і камсамольскай арганізацый.

Аршанскі РК КП(б)Б пастанавіў выклікаць Віцебскі, Гомельскі і Жлобінскі ГК і РК КП(б)Б на сацспаборніцтва для праведзеньня такіх-жа дэкадніка ў сувязі з набліжэньнем пленуму ЦК КП(б)Б.

Парткалектывы чыгункі насьцежаць ты і шматпражкі павінны безадкладна ўключыцца ў дэкаднік праверкі і самаправеркі партыйнай і камсамольскай работы на чыгуначным транспарце.

Гэта праверка, бязумоўна, дасьць магчымасьць ліквідаваць тыя буйныя недахопы, якія ёсьць: у рабоце мясцовых партыйных і камсамольскіх арганізацый Аршанскага вузла. У гэтай праверцы павінен адыграць вялізарнейшую ролю чыгуначны друк.

Неабходна, каб насьцежгазэты кожнага цэху, дэпо, майстэрні і раённыя шматпражкі на працягу дэкадніка штодзень на старонках штодзённікаў «За работу па новаму» укрывалі ўсе недахопы ў рабоце мясцовых партыйных арганізацый, асьвятлялі ўсебакова лепшыя прыклады ўзорнай работы асобных пэхячэек, калектываў, ударнікаў-партыйцаў і камсамольцаў.

Дэкаднік праверкі і самаправеркі не ратварыць у масава-палітычную гаспадарчую кампанію, мабілізаваўшы ўсю пралетарскую грамадзкасьць чыгункі на пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне плянаў асеньня-зімовых перавозак.

А. П.

Ні кроку ад прынцыпу

Хто больш і лепш працуе — той больш атрымлівае

Бабруйскі райкалгассаюз груба скажае дырэктывы партыі і ўраду. Узяць пад строгі грамадзкі кантроль разьмеркаваньне прыбыткаў у калгасах

На дапамогу калгасам па складаньні фінпляну і разьмеркаваньня ўраджаю

Калгасы ўжо сталі пераважнай вытворчай сілай на вёсцы.

Гэта патрабуе арганізацыі далейшага замацаваньня іх фінансава-гаспадарчага становішча, без чаго не магчыма правільнае вядзеньне буйнай калектывізаванай гаспадаркі.

Для таго, каб яшчэ ў гэтым годзе мець неабходныя матар'ялы аб фінансава-гаспадарчай дзейнасьці калгасаў, калгасы павінны не пазьней 10 кастрычніка г-г. скласьці фінансавыя пляны за бягучы год па дадзенай ім форме. Складаньне гэтых плянаў цесна ўвязана з разьмеркаваньнем даходаў і ўраджаю 1931 г., Сваячасовае і добраякаснае складаньне фін. плянаў дасьць магчымасьць найбольш правільна падыйсьці да разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю паміж калгасьнікамі, найбольш правільна вылічыць абкладаемы сельска-гаспадарчым падаткам даходаў і зьлічыць падатак, дасьць магчымасьць высьвятліць пасільнасьць выкананьня кожным калгасам фінансавых абавязкаў перад Дзяржавай, азначыць разьмер магчымых укладаньняў уласных сродак калгасамі на папырэньне сваёй гаспадаркі і разьмер неабходных крэдытаў. Акрамя ажыцьцяўленьня пералічаных практычных задач, складаньне паказаных плянаў мае буйнейшае палітычнае значэньне ў сэнсе замацаваньня і далейшага руху калгаснага будаўніцтва.

Прымаючы пад увагу, што вучот і справаздачнасьць на падставе якіх павінны быць складзены фінансавыя разьлікі (пляны) і ўтворана разьмеркаваньне даходаў у большай частцы калгасаў арганізаваны толькі ў гэтым годзе і знаходзіцца не на належнай вышыні. Калгасам павінна быць аказана дапамога ў гэтай справе і ў першую чаргу з боку фінансава-банкаўскіх работнікаў, з боку прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый.

Па лініі Наркамфіну, Дзяржбанку, Цэнтральнага Савету Прафэсыянальных Саюзаў БССР дадзены мясцом адпаведныя дырэктыўныя паказаньні. Трэба, каб гэтыя дырэктывы не засталіся на паперы, а знайшлі сваё ажыцьцяўленьне, шляхам мабілізацыі раённымі арганізацыямі неабходнай колькасьці працаўнікоў, з узелам настаўніцтва, работнікаў саўгасаў і МТС і пасылкі іх у калгасы на 10—15 дзён, асабліва ў тыя, дзе нездавальняюча пастаўлен вучот і справаздачнасьць.

Раённы друк, селькоры павінны ўключыцца ў гэтую кампанію, асьвятляючы добрыя прыклады і адмоўныя бакі ў гэтай працы.

Складаньне фінансавага пляну і папярэдняе разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю за 1931 год павінны быць выкананы ва ўстаноўленыя тэрміны.

Белы.

За правільнае разьмеркаваньне калгаснага ўраджаю

Вялікую ролю ў далейшым разгортваньні калектывізацыі адыгрывае гаспадарчы калектывізацыі. Правільнае замацаваньне калгасаў. Правільная арганізацыя працы ў калгасах, поўнае ўкараненьне зьдзельлічыны, уліку працы, ліквідацыі абязьлічны, уліку працы, ліквідацыі абязьлічкі—будзе вырашаць далейшыя посьпехі калектывізацыі. Па зьвестках на 1 кастрычніка пераведзена на зьдзельшчыну 8.596 калгасаў БССР, або 85,8 проц., забясьпечана працоўнымі кніжкамі 80,6 проц., вядуць рэгулярны запіс працадзён толькі 68 проц. ад агульнай колькасьці калгасаў.

Яшчэ горш стаіць справа з улікам колькасьці і якасьці працы: на сёньняшні дзень з 10.093 калгасаў вядуць рэгулярны запіс працадзён толькі 6715.

Рад раёнаў у гэтай працы ганебна цягнецца ў хвасьце. Так у Асьвейскім раёне з 62-х калгасаў вядуць рэгулярны запіс толькі 7, Чырвонапольскім з 110—12, Парыцкім з 126 калгасаў—толькі 12, Тураўскім з 33 калгасаў—толькі 6, Глускім з 126 калгасаў толькі 75, Бешанковіцкім з 255—толькі 117.

Бяз уліку няма сапраўднай зьдзельшчыны. Адсутнасьць уліку прыводзіць да ўраўніловкі ў разьмеркаваньні ўраджаю. Чым тлумачацца такія прарывы на гэтым фронце? У радзе адстаючых раёнаў існуе апартуністычная неразьбарлівасьць зьдзельшчыны і уліку працы на калгасах.

Вакол гэтага важнейшага гаспадарча-палітычнага пытаньня не мабілізавана грамадзкая думка.

Трэба ўжыць усе захады да таго, каб у бліжэйшую дэкаду кожны калгас быў пераведзен на зьдзельшчыну, забясьпечан працоўнымі кніжкамі, трэба наладзіць дакладны ўлік працы.

«Дзень ураджаю і калектывізацыі» кожны калгас павінен сустрэць увядзенай зьдзельшчынай, наладжаным улікам працы, правільным разьмеркаваньнем першай паловы даходаў за 1931 год.

Л—сь.

Зьнішчыць практыку кулацкай ураўніловкі/ Бабруйскага райкалгассаюз

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Разьмеркаваньне ўраджаю па калгасах Бабруйшчыны праходзіць надзвычайна марудным тэмпамі. На сёньняшні дзень падлік даходаў і разьмеркавань не іх праведзена толькі па аднэй чацьвёртай частцы калгасаў. У гэтай рабоце няма апэрацыйнага кіраўніцтва з боку райкалгассаюзу. Больш таго, райкалгассаюз, пасылаючы свае дырэктывы аб разьмеркаваньні ўраджаю і даходаў, даў калгасам няправільную, яўна шкодную па сутнасьці ўстаноўку. Наўпрэкі правільным дырэктывам Наркамзему і Калгасцэнтру аб разьмеркаваньні натуральнай частні даходаў паміж калгасьнікаў тэй-жа натурай, райкалгассаюз даў дырэктыву аб вызначэньні гэтых даходаў у грашовых вылічэньнях. Гэтая ўстаноўка праведзена ў жыцьцё амаль што 30 калгасамі, якія правялі работу па разьмеркаваньні даходаў.

Матар'ялы разьмеркаваньня даходаў па асобных калгасах устанаўляюць сумы «заработкаў» калгасьнікаў у грашовых вылічэньнях, замест вызначэньня долі прадуктаў, якія прыпадаюць на кожны працадзень кожнага калгасьніка ў паасобку.

Асобныя калгасы пры разьмеркаваньні ўраджаю выкрэсьліваюць недатыкальны фуражны фонд і не вызначаюць гэтых фондаў на разьвіцьцё жывёлагадоўлі.

Райкалгассаюз з выпраўленьнем дапушчанай ім грубай палітычнай памылкі не сьпяшаецца, з-за чаго яшчэ больш паглыбляецца гэта грубая палітычная памылка, разьмеркаваньне ўраджаю зрываецца.

Па гэтай кулацкай практыцы трэба рашуча ўдарыць, трэба прымусіць райкалгассаюз на ходу выправіць памылкі і забясьпечыць апэрацыйнае кіраўніцтва ходам працы па разьмеркаваньні даходаў у калгасах.

А. Дамброўскі.

„Дзень ураджаю і колектывізацыі" сустрэнем без запазычанасьці

Калгас «Чырвоны маяк», Н.-Максімавіцкага сельсавету, Клічаўскага раёну, дабіўся перамог у выкананьні пляну сяўбы, ворыва і ўборкі бульбы. Сяўба скончана яшчэ 20 верасьня, плян дадзены РКС перавыкананы. Калгас да 5 кастрычніка ўзьняў пад зяб 50 проц. усяе падлягаючай плошчы і разам з гэтым высунуў свой сустрэчны плян па скончэньні зяблевага ворыва да 15 кастрычніка.

Калгас таксама паставіў пытаньне, каб ніводнага гектару бульбы не засталося ня ўбраным да 15 кастрычніка.

Цяпер калгас на полі вылучыў аддзельныя брыгады, якія заключылі паміж сабой спаборніцтва і ўдарніцтва на шпарчэйшае скончэньне ўборкі.

Калгасьнікі упэўнены, што да «Дню ўраджаю і калектывізацыі» прыдзем без запазычанасьці.

Рубашны.

Бульбу і гародніну—пралетарскім цэнтрам

Сёньня пачынаецца трохдзёньнік уборкі і адгрузкі бульбы

Прыклад Бабруйскага заводу імя Варашылава—на ўсе прадпрыемствы БССР. Чыгунка абавязана забясьпечыць адгрузкі неабходнай колькасьцю вагонаў

З 8-га па 11-га кастрычніка абвяшчаецца трохдзёньнік па копцы і ўборцы бульбы

Тэлеграма райкомам, гаркомам КП(б)Б, райвыканкомам, райпрафсакратарыятам

Прызнаючы тэмпы ўборкі і адгрузкі бульбы зусім нездавальняючымі ЦК пастанавіў з 8 да 11 кастрычніка арганізаваць ўсебеларускі трохдзёньнік копкі і адгрузкі бульбы. Правядзеце масавую работу ў калгасах, саўгасах, вёсках, мястэчках і гарадох па агульным выхадзе працоўнага насельніцтва з транспартам на копку, возку, адгрузку і бортаваньне бульбы. Камандыруйце ўвесь партыйны, савецкі, камсамольскі і прафсаюзны актыў у сельсаветы, калгасы, саўгасы і населішчы для арганізацыі трохдзёньніка. Уборку бульбы ў калгасах і саўгасах правядзеце выключна на зьдзельшчыне, наладзьце штодзённае выкананьне норм, адначасова дабецеся якасьці ўборкі. Лічыце баявой задачай скончэньне ўборкі і адгрузкі бульбы ў вызначаны тэрмін.

Сакратар ЦК КП(б)Б Шаранговіч.
Старшыня СНК Галадзед.

Старшыня ЦСПСБ Рыжоў.

7 кастрычніка 1931 г.

Усім сакратарам райкомаў КП(б)Б і старшыням райвыканкомаў

Загатоўка насеньня кармавых траў, кораньплодаў і гародных культур раёнамі не разгорнута, што пагражае зрывам гадавога пляну загатовак.

Прапануем тэрмінова праверыць работу загатоўчых арганізацый і давядзеньне пляну загатовак да калгасаў, аднасобнікаў, заможных гаспадарак.

Забясьпечыць арганізацыю ўборкі, абмалоту, здачы і выкананьне пляну загатовак у вызначаныя тэрміны.

Прыцягнеце да гэтай работы мабілізаваных.

Сакратар ЦК КП(б)Б Шаранговіч.
Старшыня СНК Галадзед.

Мы свае абавязкі выканалі. Слова за вамі

Зварот рабочых мэханічнага заводу імя Варашылава—г. Бабруйска, да ўсіх рабочых, работніц, жонак рабочых - прадпрыемстваў Бабруйску, Гомелю і Менскага заводу імя Варашылава.

Рабочая кляса пад правільным кіраўніцтвам камуністычнай партыі, дабілася яшчэ адзнай вялікай перамогі на фронце палепшаньня быту рабочых, палепшаньня рабочага забясьпячэньня, арганізацыі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі буйных прыгарадных каапэрацыйных гаспадарак. Гэтакая-ж буйная гаспадарка вырасла у Бабруйску на 3.000 га зямлі, якая павінна даць сёлета—5000 гародніны і бульбы, 700.000 літраў малака, 1.700 цэнт. мяса і г. д., такім чынам гаспадарка павінна сапраўды забясьпечыць рабочае забясьпячэньне.

Рабочыя, работніцы і жонкі рабочых паказалі лепшыя прыклады ў правядзеньні вясеньня-пасеўнай і праполачнай кампаній на прыгараднай гаспадарцы.

Нам засталося шмат убрать з поля: бульбы 200 га, гародніны 130 га, засіласавать 2.300 тон, убрать 5 га фруктаў з садоў.

Мы варашылаўцы 1-га кастрычніка арганізавалі:

100 проц. масавы выхад рабочых і работніц на палі прыгараднай гаспадаркі, мы паказалі лепшыя прыклады ўдарнай працы на ўборцы.

Мы з свайго боку абяцаем перавыканаць даведзены да нас плян ўборкі. Мы мабілізуем на гэту справу жонак рабочых, і ўтрымаецаў на дапамогу свячасоваму скончэньню ўборкі. Наш лёзунг ніводнага кілёграма гародніны, бульбы і фруктаў не павінна застацца на палёх, мы павінны забясьпечыць скончэньне ўборкі на прыгараднай гаспадарцы да 15-X.

Мы выклікаем рабочых, работніц, і жонак рабочых усіх прадпрыемстваў г. Бабруйску, Гомлю і менскага заводу імя Варашылава, скарыстаць наш прыклад. Арганізуйце адзінныя выхадныя дні, калектыўныя выхады на полі прыгарадных гаспадарак, забясьпечце свячасова ўборку з поля гародніны, бульбы і фруктаў. Устанавеце сталы рабочы кантроль за свячасовай дастаўкай гародніны спажыўцу, адгрузкай ў рабочыя цэнтры, падрыхтоўкай гародніна-хавалень, правядзеньне засолкі.

Па даручэньні агульнага сходу рабочых і адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу.

Сакратар парткалектыву: **Літвін**

Старшыня завкому: **Фейгін.**

Дырэктар заводу: **Бабкін**

Адміністрацыя чыгункі зрывае адгрузку бульбы

Бульбазагатоўкі па **Крупскім раёне** праходзяць здавальняючымі тэмпамі. Бульба штодня прыбывае на ст. Бобр і Крупкі. Але-ж адгрузка гэтай бульбы адбываецца вельмі марудна толькі таму, што адміністрацыя чыгункі не дае патрэбнай колькасьці вагонаў. Так напрыклад, на 2-X-31 г. ст. **Борб** было запатрабавана 10 вагонаў, але-ж дыспэтчэр не даставіў ніводнага вагона, у выніку чаго бульба ссыпалася на станцыю ў хлеў, у які ўжо засыпана больш 10 вагонаў. На 3-X-31 г. дастаўлена было ўсяго 7 вагонаў.

3-X-31 г. са ст. Бобр і Крупкі адгружана 14 вагонаў бульбы, але каб была дастаўлена адпаведная колькасьць вагонаў, дык можна было-б адгрузіць значна больш.

Бульба, якая ссыпана ў хлеў падмыта дажджом і псуецца. На пытаньне колькі будзе адгружана бульба, прыёмшчык бульбы адказаў: **«калі будуць вагоны, а калі яны будуць невядома».**

РК КП(б)Б і РВК, трэба зрабіць усё неабходнае, для таго, каб бульба не залежвалася на станцыях, каб яна хутчэй накіроўвалася ў пралетарскія цэнтры, у прыватнасьці ў Ленінград. **Адміністрацыя чыгункі павінна забясьпечыць нормальную адгрузку бульбы прадстаўляючы патрэбную колькасьць вагонаў.**

Пасажыр Бобра.

Непаваротлівасьць лёзьненскіх загатоўцаў зрывае загатоўку і адгрузку бульбы

З Лёзьненскага раёну для патрэб пралетарскіх цэнтраў трэба адгрузіць 7.000 тон бульбы. На 20-га верасьня загатоўлена 12.175 цэнтнераў, з якіх адгружана ў прамысловыя гарады 12.122 цэнтн. 53 цэнтн. не адгружана, з прычыны адсутнасьці вагонаў.

Па лініі райспажыўсаюзу гадавы плян загатовак бульбы выкананы ўсяго на 4 проц. Каапэрацыйная калгасная сыстэма (райспажыўсаюз, райкаапсаюз) яшчэ праяўляюць слабасьць, непаваротлівасьць і блытаніну ў гэтай рабоце. Старшыня праўленьня райкаапсаюзу т. **Гулецкі** недаацэньвае гаспадарча-палітычнага значэньня кампаніі па загатоўцы бульбы. **Гулецкі** лічыць гэту справу «другарадная» і ня прымае ніякіх мер для фарсаваньня бульбазагатовак. На 20-га верасьня райкаапсаюзам не загатоўлена ніводнага цэнтнэра бульбы.

Раённыя, партыйныя і савецкія арганізацыі павінны зламаць апартуністычныя рагаткі, якія перашкаджаюць выкананьню загатоўчых плянаў.

Сымон Вольны.

Прымусіць Жлобінскі вузел выконваць свае абавязкі

СЛУЦАК. (наш кар.). Друк ужо некалькі разоў сыгналізаваў аб прарывах у адгрузцы бульбы Ленінграду і іншым пралетарскім цэнтрам з **Слуцкага раёну.**

Да гэтага часу прарыў яшчэ не ліквідаваны, а наадварот усё больш паглыбляецца.

Ня гледзячы на дадзены нарад **Жлобінскаму чыгуначнаму вузлу** аб прадстаўленьні поўнай колькасьці вагонаў для пагрузкі бульбы, апошні нараду ня выконвае.

Кожны дзень замест 15 вагонаў адгружаецца 3—5.

На 2 кастрычніка Слуцкае аддзяленьне Белсадгароднінны павінна было адгрузіць Ленінграду 17 вагонаў бульбы, а адгрузіла толькі 5,—больш не далі вагонаў.

Аб такім становішчы пісалася ў адпаведныя органы, але пакуль што ніякіх мер ня прымаецца.

Слуцкае аддзяленьне Саюзтрансу на гэтае агіднае становішча не зварочвае ніякай увагі.

З прахладцам да гэтай справы адносіцца і загадчык адгрузвачнай базы **т. Сакалоўскі.**

Значным тормазам зьяўляецца і адсутнасьць абапалаў, якіх дырэктар лесапрамгасу т. **Дашко** адмаўляецца даваць, а пасылае ў Кучына за 25 клм, куды немагчыма паехаць з-за адсутнасьці падводаў.

На гэта трэба зьвярнуць увагу, бо абапалы хацяй і «дробязь», але-ж бяз іх немагчыма рабіць адгрузку.

Адпаведныя органы павінны ўзьдзейнічаць на Жлобінскі чыгуначны вузёл, які зрывае адгрузку бульбы, не даючы патрэбнай колькасьці вагонаў.

Між іншым трэба адзначыць, што на базе марынуецца 8 вагонаў экспартных яблак, якія хутка папсуюцца і іх ня адгружаюць таксама з-за адсутнасьці вагонаў.

А. Курдо.

Мабілізаваліся на правядзеньне ўборкі і загатовак

МАГІЛЕЎ. (Белта). Пастановай райкому КП(б)Б для ліквідацыі прарыву па ўборцы плодагародніны і бульбы і выкананьня пляну загатовак, з 2-га кастрычніка абвешчаны двухдэкаднік штурму прарываў. Прадпрыемствы, установы і школы гораду для пасьпяховага ажыцьцяўленьня мерапрыемстваў двухдэкадніка на аснове сацспаборніцтва шырока разгарнулі работу па насылцы ўдарных брыгад у саўгасы і калгасы для ўборкі бульбы. 2-га кастрычніка рабочыя **рымарнай фабрыкі** паслалі тэрмінам на 10 дзён—100 чалавек, Пэдінстытутам пасланы—7 брыгад ў 400 чал., рабочыя чыгуначнікі вылучана брыгада ў 100 чалавек. Работа па далейшай пасылцы брыгад на штурмаваньне прарываў, уборкі, разгортваецца.

Уваравіцкі раён павінен ліквідаваць ганебнае адставаньне

Згодна пляну, **Уваравіцкі раён** павінен загатовіць 13.169 тон бульбы, з якіх 8 тысяч тон павінна быць адпраўлена рабочым Ленінграду.

У раёне па пляну трэба было прыступіць да копкі бульбы з 15-IX—31 г. Масавую вывазку трэба было пачаць па асобных сельсаветах раёну з 20—21 верасьня, а па іншых з 28-IX. Але становішча сёньняшняга дню гаворыць аб тым, што намечаныя пляны па копцы бульбы як на аднаасобным, так і па сацыялістычным сэктары зрываюцца.

У большасьці калгасаў яшчэ ня прыступлена да масавай копкі бульбы. Такі буйны калгас як калгас імя Будзёнага выкапаў ўсяго толькі каля 10 га, а пасаджана бульбы больш 100 га.

Плян адгрузкі бульбы рабочым цэнтрам замежы БССР выкананы толькі на 1 проц. (132 тоны).

Такое ганебнае адставаньне ў копцы і адгрузцы бульбы тлумачыцца тым, што ка мясцох партыйныя, камсамольскія і інш. арганізацыі не пераключыліся на копку бульбы, бо яны прытрымліваюцца апартуністычнай стаўкі на чарговасьць кампаніі.

Сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкай масы насельніцтва не праведзена масавая работа аб важнасьці свячасовай копкі і адгрузкі бульбы рабочым цэнтрам.

Апараты раённых устаноў—райкаапсаюзу і райкалгассаюзу не пераключыліся на работу па бульбазагатоўках, таму апрымаўся поўны самацёк у выкананьні загатоўчых плянаў. Бульбазагатоўкі стаялі па заўвагай ўпаўноважаных РК КП(б).

Напрыклад, **старшыня калгасу «Перамога»** і ён-жа сакратар партячэйкі т. Войтаў кажа: **«пакуль не пасеем жы

МАСАВЫ АГЛЯД работы САВЕТАЎ

Рабочыя, калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы ўключаюцца ў агляд

Сёньня ў аглядзе ўдзельнічаюць: Віцебск і Дуброўна

Шырэй разгарнуць фронт масавага агляду. Вышэй ударныя тэмпы падрыхтоўкі да справаздачнай кампаніі

Узмацніць тэмпы падрыхтоўкі да справаздачнай кампаніі саветаў

Апошнія даныя аб падрыхтоўцы саветаў да справаздачнай кампаніі, кажуць, што большасьць саветаў не надалі гэтай палітычнай кампаніі належных тэмпаў.

Рад РВК таксама канкрэтна не распрацавалі мерапрыемстваў па правядзеньні гэтай кампаніі. Мы ня можам мірыцца з самацёкам, які наглядаецца ў некаторых раёнах. Правядзеньне ўсіх палітычна-гаспадарчых кампаній павінна быць увязана з разгортваньнем масавай работы саветаў. Апартуністычная стаўка на самацёк павінна быць рашуча адхілена.

Па радзе раёнаў сельсаветы не павярнуліся тварам да калгаснай вытворчасьці, слаба працуюць сэкцыі саветаў і вытворчыя нарады. Дэпутаты савету ў калгасах і саўгасах адчуваюць ца слаба. Роля дэпутацкай групы, як мясцовага органу савету, ня ўзьнята на належную вышыню. Праверка работы саветаў, сама справаздачная кампанія павінны пакласьці канец апартуністычнаму самацёку, а разам з гэтым замацаваць дасягненьні па ўцягненьні шырачэзных мас у кіраўніцтве дзяржаваю, забясьпечыць па-бальшавому выкананьне генэральнай лініі партыі.

Надзвычайную ўвагу гэтай палітычнай кампаніі надаюць таксама раёны, як ЕЛЬСКІ і БЫХАЎСКІ. ЕЛЬСКІ раён распрацаваў практычную праграму аб гляду работы і тыя вузлавыя пытаньні, якія зараз стаяць перад саветамі і РВК. Разьбіваючы свой плян на 7 этапаў работы, раён асабліва завастрае ўвагу на павароце с.-с. тварам да калгаснай вытворчасьці. Быхаўскі раён распрацаваў канкрэтны каляндарны плян правядзеньня гэтай кампаніі. Ён вылучыў 46 упаўнаважаных і прымацаваў іх да праверачных брыгад і сельсаветаў. Строга паводле пляну раён праводзіць праверку, справаздачуня толькі асабных членаў с.-с., іх сэкцый, а нават прэзыдыумаў. Усе ўпаўнаважаныя ўжо працуюць па сельсаветах. Частка другіх раёнаў таксама пачала падрыхтоўку да гэтай кампаніі: Капыль, Жлобін, Ворша і рад іншых. Аднак, гэта ня прымае масавага характару. Нажаль, з усіх раённых газэт толькі 4 пачалі разгортваць работу па аглядзе масавай работы саветаў. Да такіх адносяцца—Быхаўская, Вушацкая, Аршанская, Шклоўская.

У саўгасах нарадзіўся новы тып рабочага-змагара за сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі. Гэта вялікая армія актыву павінна быць прыцягнута да работы ў саветах. Значную ролю па ўзмацненьні масавай работы саветаў павінны адыграць профсаюзы. Пастанову ЦСПСБ аб удзеле саюзаў у гэтай кампаніі падхапілі яшчэ ня ўсе саюзы. Мы ня маем канкрэтных прыкладаў іх падрыхтоўкі да гэтай кампаніі. Газэта «С.-Г. рабочы» не пачала шырокай кампаніі за ўздым мас на праверку работы саветаў, на ўдзел саветаў у будаўніцтве саўгасаў.

Зусім не пачаў падрыхтоўкі да справаздачы такі буйны прамысловы асяродак, як Гомель. У Гомлі можна шмат чаму павучыцца. Адно тое, што Гомельскі гарсавет, шырока разгортваючы масавую работу, мабілізуючы масы на выкананьне гаспадарча-палітычных задач—першы выканаў плян мабілізацыі сродкаў у III кв. Аднак, ёсьць у Гомлі адмоўныя бакі, ня зроблены круты паварот у галіне каапэрацыйнага гандлю, грамадзкага харчаваньня. Пралетарскія масы Гомлю павінны штурмаваць прарывы, змагацца за выкананьне і перавыкананьне пляну. Таму агляд работы гарсаветаў, сама справаздачная кампанія павінны прыцягнуць шырачэзныя масы рабочых Гомлю з тым, каб на хаду выправіць недахопы, яшчэ больш узмацніць ролю савету, як органу пралетарскай дыктатуры. Масавая работа Гомельскага савету павінна служыць прыкладам для іншых гарсаветаў. Гомельскі гарсавет безадкладна павінен распачаць гэту кампанію з шырокім асьвятленьнем у друку яго работы.

Трэба па ўсім фронце шырока разгарнуць падрыхтоўку агляду работы саветаў і саміх справаздач. У гэту работу павінны ўключыцца ўсе арганізацыі, цэнтральны і мясцовы друк, разгарнуўшы сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне кампаніі.

П-н.

Чакаем адказу ад Забалоцкага сельсавету

Рад сельсаветаў Рагачоўскага раёну плянуецца ў хвасьці выкананьня ўсіх палітычна-гаспадарчых кампаній, ня здолеў перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з сучаснымі тэмпамі. Прыкладам узорнай пастаноўкі работы можа служыць Побалаўскі сельсавет. Ён па бальшавіцку ўключыўся ў шыпідзенны штурм ліквідацыі прарываў і выклікаў на спаборніцтва Забалоцкі сельсавет па наступных пунктах:

1. Выканаць збожжазагатоўкі да 15 кастручніка.
2. Скончыць поўнасьцю бульбазагатоўку да 20-X-31 г.
3. Сабраць на 100 проц. с.-г. падатак, страхоўку і самаабкладаньне.
4. Да 1 сьнежня скончыць лёназагатоўкі.
5. Загатоўкі сена і саломы скончыць да 1-XI-31.
6. Рэалізацыю пазыкі 5-ці годні ў 4 гады і акцый трактарацэнтру скончыць на 100 проц. да 1-XI.

Я. С.

Віцебскі Гарсавет уключыўся ў масавы агляд

ВІЦЕБСК. (Наш кар). Віцебскім гарсаветам агляд масавай работы саветаў толькі распачаты. Падрыхтоўчай работы да гэтай кампаніі не праводзілася. Гарсавет абмежаваўся толькі тым, што паслаў у сельскія саветы інструкцыі па правядзеньні гэтай кампаніі.

6 верасьня гэтае пытаньне абгаворвалася на паседжаньні гаркому КП(б)Б, на якім прынята рашэньне мабілізаваць у сельсаветы для правядзеньня агляду масавай работы і справаздачнай кампаніі саветаў 14 чалавек, якія на мясцох павінны гэтую работу праводзіць цесна з выкананьнем пляну гаспадарча-палітычных кампаній.

Вылучаныя таварышы не пазьней 10 кастручніка выяжджаюць на месцы і будуць там знаходзіцца да канца кампаніі.

Шульман.

Санюкоўскі сельсавет рапартуе аб ходзе агляду саветаў

Газэце „Савецкая Беларусь"

(Па тэлеграфу)

ЕЛЬСК. Падрыхтоўчая работа да справаздачнай кампаніі па Санюкоўскім сельсавеце праходзіць пасьпяхова.

Сельсавет дабіўся ўзорнай работы і апэрацыйнай гібкасьці ўсіх зьвеньняў савету. Актыў зараз перакінут, у сувязі з масавым аглядам саветаў і справаздачнай кампаніяй, на ліквідацыю прарываў. У макеце „Ударніка Савету" узяты ўпор на больш жорсткі наступ на капіталістычныя элемэнты вёскі. Асноўная палітычная ўстаноўка макету—гэта ўсямернае замацаваньне калгаснай вытворчасьці.

Калгасныя бядняцка-серадняцкія масы даюць цьвёрдае абяцаньне партыі і ўраду, што выканаюць усе заданьні па сяўбе і зябу. У час масавага агляду і падрыхтоўчай работы да справаздачнай кампаніі работа па мабілізацыі сродкаў і загатоўках будзе значна ўзьнята.

Упаўнаважаны РВК ГЕРАСІМЕНКА.
Старшыня сельсавету САМОЙЛІЦА.
Сэкратар ячэйкі КП(б)Б.

Там, дзе няма масавай работы

Ліпаўскі сельсавет, Мазырскага раёну, яшчэ не перабудаваў свае работы ў адпаведнасьці з задачамі, якія пастаўлены перад ім партыяй і ўрадам. Сэкцыі пры сельсавеце зусім не вядуць ніякай работы.,

Сельсаветам зроблена шмат перагібаў па ўліку аб'ектаў абкладаньня, па выяўленьні канъюнктурных даходаў, якія ўстанаўляліся бяз усякіх падстаў. У выніку чаго, абкладаньне па сельсавеце было не сапраўдным на 45 проц., і фінчастка РВК была вымушана зьняць 11.000 з абкладзеных сум.

Калектывізацыя па сельсавеце праходзіць зусім марудна. За час уборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы прыліву ў калгасы беднякоў і сераднякоў амаль ня было. Сельсавет калектывізаваў усяго на 29 проц. Работа з беднатой не праводзіцца. Не вядзецца рашучай барацьбы з кулацтвам, якое ўсімі мерамі імкнецца сарваць пасьпяховае ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў партыі і ўраду на вёсцы (в. Ператок, Алісейка Гаўрылла). Ніякай працы не вядзецца па замацаваньні існуючых калгасаў, слаба пастаўлена арганізацыйная работа ў калгасах.

Выкананьне плянаў збожжазагатовак, бульбазагатовак, лесазагатовак ды вывазак і фінплян знаходзіцца пад патрозай зрыву.

Марудна ідзе спатнаньне плацяжоў і выкананьне цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак. Пасобныя члены сельсавету на агульных сходах вёсак адкрыта выступаюць супроць гаспадарча-палітычных кампаній, абараняючы кулакоў і заможнікаў. Да ўдзелу ў гаспадарча-палітычных кампаніях ня прыцягнута грамадзкасьць.

Па сельсавеце яшчэ да гэтага часу ня ўбрана каля 100 га сенажаці

Насьценгазэты пры сельсавеце няма. К. С. Т. У не праводзіць ніякай работы. Старшыня камітэту Шастакоў займаецца шкодніцтвам. Сельскагаспадарчыя машыны ў камітэце папсованы. Трыер увесь час стаяў пад адкрытым небам і псаваўся. У выніку чаго ў асеньнюю пасеўную кампанію засеяна неачышчаным насеньнем 70—80 проц. пасеўнай плошчы.

Ворыва пад зяб па сельсавеце толькі пачынаецца.

РК КП(б) і РВК павінны пацікавіцца работай Ліпаўскага сельсавету і неадкладна ўжыць належныя захады.

ЛІСТ.

Масавы агляд пачаўся

ДУБРОЎНА. (БЕЛТА). Пачалася падрыхтоўка да справаздачнай кампаніі саветаў. Мабілізуецца ўся грамадзкасьць для прыняцьця актыўнага ўдзелу ў аглядзе работы сельсаветаў. Райгазэта «За пралетарскае будаўніцтва» праводзіць эстафэту агляду дзейнасьці саветаў, для чаго створаны рабселькораўскія брыгады. Справаздачная кампанія ў раёне павінна зьявіцца праверкай баяздольнасьці саветаў у барацьбе за генэральную лінію партыі.

СОТЫ ПАКАЗ „ГУТЫ"—

буйнейшая перамога на фронце тэатральнага будаўніцтва

Толькі пад кіраўніцтвам КП(б)Б можа расьці і разьвівацца культура нацыянальная па форме і сацыялістычная па зьместу

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна,

вышэй узьняць сьцяг барацьбы за новае пралетарскае мастацтва

З вялікім задаваленьнем Галоўмастацтва БССР адзначае соты паказ пастаноўкі на беларускай сцэне «Гуты» Р. Кобеца—перамогі калектыву БДТ-1.

Група беларускіх контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў разам з нацыянал-аўтартуністамі імкнуліся не дапусьціць «Гуту» на сцэну. Аднак, пад націскам пралетарскай грамадзкасьці п'еса была ўзята ў распрацоўку.

Пастаноўка «Гуты» зьяўляецца першым пробліскам стварэньня беларускага пралетарскага тэатмастацтва. Перамога калектыву тэатру—гэта перамога ўсёй беларускай пралетарскай грамадзкасьці, усяго беларускага пралетарскага тэатфронту.

Галоўмастацтва ўпэўнена, што калектыў БДТ-1, атрымаўшы бліскучую перамогу, пойдзе наперад і ў сваёй штодзённай рабоце пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі яшчэ больш аддасць будзе працаваць над стварэньнем вялікага мастацтва бальшавізму.

Для таго, каб дабіцца далейшых перамог, калектыў тэатру павінен быць да канца адданы спрасе рабочай клясы, павінен аўладаць тэорыяй Маркса і Леніна, арганічна зьвязацца з рабочай клясай, змагацца за дылялектычна-матэрыялістычную мэтадалёнію ў рабоце тэатру і за тэатральную тэхніку культуры.

Гарачае прывітаньне калектыву актораў, аўтару, рэжысуры і ўсім удзельнікам пастаноўкі першага арыгінальнага беларускага пралетарскага паказу.

Няхай жыве КП(б)Б—кіраўнік і арганізатар будаўніцтва сацыялізму.

Галоўмастацтва—Гурскі, Любан, Шамшур.

Да новых мастацкіх перамог

Беларускае таварыства савецкіх драматургаў, кампазытараў, аўтараў кіно і эстрады шчыра вітае Беларускі пр-пны Дзяржаўны тэатр у дзень сотага паказу пралетарскае п'есы «Гута».

Таварышы! Соты паказ п'есы пралетарскага пісьменьніка Кобэца «Гуты»—гэта яскравейшая адзнака росту тэатру, росту пралетарскага мастацтва.

Мы ўпэўнены, што тэатр і ў далейшай сваёй працы будзе ісьці па гэтым гаваровым шляху, і надалей будзе творцам вялікага мастацтва бальшавізму.

Дык няхай-жа надзвычайна вялікі поспех пралетарскага паказу запаліць вас творчым уздымам і павядзе да новых мастацкіх заваёў і перамог, шлях да якіх вам паказвае наш адзіны кіраўнік—Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі.

ПРАЎЛЕНЬНЕ.

„А бяз тэхнікі--які-ж сацыялізм...?"

У соты раз граючы ролю вынаходцы Мароза, не ўдаючыся ў падрабязны аналіз, у кароткіх рысах я хачу сказаць аб ідэйнай устаноўцы аўтара, рэжысэра і маёй, як выканаўцы гэтай ролі ў п'есе «Гута».

Калі паўтара гады таму назад я атрымаў у работу гэтую ролю, я адразу ўгледзеў у ёй матар'ял ня толькі «іграваога» парадку, але і вялікую сацыяльна-клясавую сутнасьць. Захапіла тая праўда, з якой аўтар тав. КОБЕЦ гаворыць гэтым вобразам вусцамі гэтага старога пралетара. І перада мною паўстала задача ў мастацкай форме, вобразам і дзеяньнем Мароза сказаць аб праблемах падрыхтоўкі кадраў, мэханізацыі вытворчасьці, вынаходзтва, сказаць аб барацьбе за ідэю, да якое заклікае партыя і рабочая кляса.

Перада мной паўстала задача на тэме п'есы паказаць труднасьці, перашкоды, з якімі сустракаецца рабочы-вынаходца без належнага аўладаньня тэхнікай, для зацьверджаньня ў агульнай ідэі спэктаклю правільнасьці ўстаноўкі камуністычнай партыі ў пытаньнях вырашэньня гэтых праблем.

У процілегласьць скрытнасьці, палахлівасьці, хістаньням Мароза побач з ім расьце і выхоўваецца Цыганок—камсамолец, адкрыты, з новай псыхікай, рашучы, сьмелы—надзейная зьмена.

Асноўнасьць мэтаімкненьня ў Мароза я ўгрунтаваў словамі: «а бяз тэхнікі—які-ж сацыялізм?..» У гэтым клясавая сутнасьць мільёнаў Марозаў, гэта ёсьць пытаньне, над вырашэньнем якога зараз змагаецца партыя і рабочая кляса.

У сьветапоглядзе і імкненьнях Мароза няма бальшавіцкай рашучасьці і сьмеласьці і яго ў гэтым некалькі дапаўняе Цыганок, а таму цалкам вобраз Мароза я не разглядаю поўнакроўным і поўнацэнным у сваёй пралетарскай сутнасьці. Вобраз Мароза і разглядаю, як сацыяльнае зьявішча, якое толькі будучы дапоўненым бальшавіцкай рашучасьцю можа быць зацьверджана, як узор.

На сёньняшні дзень павінен адмерці мягкі сымпатычны дзядуля, які ня здольны да адкрытай складанай і моцнай барацьбы.

Перада мной стаяла і яшчэ задача ня зьнізіць вобраз да паказу схэмы і голага фармалізму і, паколькі ўся п'еса трактуецца ў пляне умоўнага рэалізму, я ўзяў Мароза ў рэалістычных тонах, абмінаючы па магчымасьці бытавыя дробязі.

Заслужаны артыст рэспублікі У. КРЫЛОВІЧ.

БДТ-1

Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменьнікаў горача вітае калектыў першага беларускага дзяржаўнага тэатру з сотым паказам п'есы «Гута», якая напісана членам нашай асацыяцыі, рабочым пісьменьнікам Р. Кобецам.

Уступіўшы паказам «Гуты» на шлях стварэньня вялікага мастацтва бальшавізму, БДТ-1 перамог тыя шкодныя нацыянал-дэмакратычныя канцэпцыі, якія доўгі час палавілі тэатр, стрымлівалі яго разьвіцьцё.

БелАПП абяцае ўсямернае падтрыманьне калектыву БДТ-1 у яго рабоце па стварэньні беларускай пралетарскай драмы.

Прыз таньне юбіляру.

Сакратарыят БелАПП-у.

У Віцебшчыне пасьпяхова закончваецца рэалізацыя пазыкі

Кантрольную лічбу па рэалізацыі пазыкі «3-га рашаючага году» Віцебскі раён выканаў на 106 проц. па горадзе і 100 проц. па вёсцы.

Спачатку касавае афармленьне падпіскі было нездавальняючым і складала на 10 верасьня 47,5 проц. Зараз, дзякуючы напружанай рабоце ўсіх працаўнікоў апчадкасы і, асабліва, мясцовых камісій садзейнічаньня, гэта справа значна палепшылася. На 20-га верасьня афармлена падпіска па горадзе на 103 проц., кантрольнага заданьня, а па вёсцы—на 89 проц.

Значна адстае яшчэ афармленьне падпіскі сярод неарганізаванага гарадскога насельніцтва, дзе афармлена толькі 82,5 проц. рэалізаванай пазыкі.

Дзякуючы ўдарнай рабоце Віцебскіх арганізацый Віцебшчына становіцца ў першыя рады раёнаў, якія пасьпяхова праводзяць рэалізацыю пазыкі «3-га рашаючага году» сваячасова замацоўваюць афармленьнем падпіскай дасягненьні ў рэалізацыі.

Бараноўскі.

Узьняць тэмпы вярбоўкі рабочай сілы

За два дні 1-га і 2-га кастручніка накіраваны Данбасу 726 чалавек рабочай сілы. Першымі па вярбоўцы ідуць раёны: Шклоўскі — 46 чалавек, Чэрыкаўскі — 24 чал., Рагачэўскі—34.

Цягнуцца ў хвасьце наступныя раёны: Чырвона-Слабодзкі з заданьня 150 чал. завярбаваў 33; Сураскі з заданьня—250 не навербаваў ніводнага чалавека. Такое-ж становішча з вярбоўкай у раёнах Церахаўскім, Буда-Кашалёўскім, Койданаўскім і Пухавіцкім.

Мясцовыя арганізацыі гэтых раёнаў не надаюць патрэбнай ўвагі справе ва бесьпячэньня рабочай сілай індустрыальных цэнтраў.

За ленінскую нацпалітыку

Ленінская нацыянальная палітыка—

НАЙАДКАЗЬНЕЙШЫ ВУЧАСТАК БАРАЦЬБЫ ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ

Хойніцкая партарганізацыя паказвае прыклад

як трэба змагацца за ленінскую нацпалітыку

Нацработа ў Хойніцкім раёне на працягу значнага часу вельмі кульгала. Больш таго: у раёне меўся рад фактаў прубейшага окрыўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Адсутнасьць належнага кіраўніцтва з боку РК КП(б)Б і РВК і тое, што яны ня здолелі мабілізаваць раённую партыйную арганізацыю і працоўныя масы на барацьбу з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе і шавінізмамі іншых колераў, прывяла раён да глыбокага прарыву ў нацработе.

Бюро ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове ад 16 мая б. г. аб стаўовішчы нацработы ў Хойніцкім раёне канстатавала «зусім недастатковае кіраўніцтва з боку Райкому КП(б)Б і фракцыі РВК ажыцьцяўленьнем ленінскай нацпалітыкі,, у выніку чаго меў месца ў раёне раз грубейшых скажэньняў лініі партыі ў правядзеньні ленінскай нацпалітыкі».

Мы ў свой час падрабязна асьвятлілі стаўовішча нацработы ў Хойніцкім раёне. (Гл. «С. Б.» ад 24 мая г. г.) Для таго, каб больш яскрава ўразумець становішча гэтай работы на сёньняшні дзень, успомнім коратка аб фактах скрыўленьня нацпалітыкі, якія мелі месца ў Хойніцкім раёне да памянутай пастановы Бюро ЦК КП(б)Б.

У асноўным гэтыя факты зводзяцца да наступнага: мясцовыя нацыянальныя сельсаветы не абслугоўвалі насельніцтва нацменшасьцяй на іх родным мове; хата-чытальня з польскай вёскі Мархлеўск была перанесена ў беларускую вёску; у школе польскай вёскі Загальле, яго гледзячы на дастатковую колькасьць польскіх дзяцей спынілі выкладаньне польскай мовы; калектывізацыя нацвёсак значна адставала ад агульнага руху калектывізацыі, што ішло ў разрэз з простай дырэктывай кастрычніковага Пленуму ЦК КП(б)Б, які высунуў «як адну з важнейшых задач бліжэйшага пэрыяду разгортваньня калектывізацыі ў нацыянальнай вёсцы...»; работа большасьці ўстаноў праводзілася выключна на расійскай мове, што зьяўлялася чічым іншым як праявай вялікадзяржаўнага шавінізму і ігнараваньнем партыі аб беларусізацыі.

Бюро ЦК КП(б)Б прыцягнула да адказнасьці вінаватых у гэтых скажэньнях ленінскай нацыянальнай палітыкі і дало РК КП(б) выразныя дырэктывы, вызначыла рад канкрэтных мерапрыемстваў, ажыцьцяўленьне якіх павінна было забясьпечыць выпраўленьне дапушчаных палітычных памылак і ўзьняцьце на належную вышыню нацработы ў раёне.

Па даручэньні Бюро ЦК КП(б)Б, Нацкамісія пры ЦВК БССР правяла нядаўна праверку выкананьня вышэйпамянёнай пастановы Бюро ЦК.

Праверкай выяўлена, што за апошні час у Хойніцкім раёне ў справе ажыцьцяўленьня нацпалітыкі і маюцца значныя дасягненьні.

Райком партыі павёў рашучую барацьбу в правявамі вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, беларускага нацдэмакратызму, яўрэйскага шавінізму і шавінізму іншых колераў.

Праведзены месячнік генэральнай праверкі беларусізацыі прайшоў пад кутком погляду практычнага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду па ажыцьцяўленьні ленінскай нацпалітыкі і абслугоўваньня нацменшасьцяй.

Для палепшаньня культурна-бытавога абслугоўваньня нацменшасьцяй пра ведзен рад практычных мерапрыемстваў. Нацыянальныя сельсаветы ўкамплектаваны адпаведнымі кадрамі работнікаў і працуюць на родным мове, у польскай вёсцы Мархлеўск адкрыта хата-чытальня, у м. Хойніці адрамантавана памяшканьне былой сінагогі, якое прыстасавана пад наклюб і хату-чытальню, у вёсках Храпках і Загальле адчынены нашыя польскія школы, у в. Мархлеўск пад польскую школы адведзен добры былы кулацкі будынак і г. д.

Выходячы з адпаведнай дырэктывы кастрычнікавага Пленуму ЦК КП(б)Б, разгорнута шырокая работа па ўзмацненьні тэмпаў калектывізацыі нацыянальнай вёскі. І ў гэтай галіне ў Хойніцкім раёне ўжо маецца значны зрух.

Вёс. Храпкі калектывізавана на 46,1 проц., у польскай вёсцы Берастэчка арганізаваны новы калгас імя Войкава з 12 гаспадарак, у астатніх нацкалгасах таксама маецца значны прыліў.

У выніку праробленай у апошні час работы процант калектывізацыі ў нацыянальных сельсаветах ужо вышэй сярэдняга па раёне.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што як раней заклінутым вучасткам работы, а наадварот,—першачарговай справай усіх раённых партыйных, савецкіх, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый.

Райком партыі павёў рашучую барацьбу в правявамі вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, беларускага нацдэмакратызму, яўрэйскага шавінізму і шавінізму іншых колераў.

Праведзены месячнік генэральнай праверкі беларусізацыі прайшоў пад кутком погляду практычнага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду па ажыцьцяўленьні ленінскай нацпалітыкі і абслугоўваньня нацменшасьцяй.

Для палепшаньня культурна-бытавога абслугоўваньня нацменшасьцяй пра ведзен рад практычных мерапрыемстваў. Нацыянальныя сельсаветы ўкамплектаваны адпаведнымі кадрамі работнікаў і працуюць на родным мове, у польскай вёсцы Мархлеўск адкрыта хата-чытальня, у м. Хойніці адрамантавана памяшканьне былой сінагогі, якое прыстасавана пад наклюб і хату-чытальню, у вёсках Храпках і Загальле адчынены нашыя польскія школы, у в. Мархлеўск пад польскую школы адведзен добры былы кулацкі будынак і г. д.

Выходячы з адпаведнай дырэктывы кастрычнікавага Пленуму ЦК КП(б)Б, разгорнута шырокая работа па ўзмацненьні тэмпаў калектывізацыі нацыянальнай вёскі. І ў гэтай галіне ў Хойніцкім раёне ўжо маецца значны зрух.

Вёс. Храпкі калектывізавана на 46,1 проц., у польскай вёсцы Берастэчка арганізаваны новы калгас імя Войкава з 12 гаспадарак, у астатніх нацкалгасах таксама маецца значны прыліў.

У выніку праробленай у апошні час работы процант калектывізацыі ў нацыянальных сельсаветах ужо вышэй сярэдняга па раёне.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што Хойніцкая парторганізацыя ня толькі выпрацуе свае памылкі, але і аб тым што яна па бальшавіцку змагаецца за ажыцьцяўленьне ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі і ўраду.

Але ў нацработе па Хойніцкім раёне яшчэ маюцца о седахопы.

Адным з асноўных такіх недахопаў зьяўляецца адсутнасьць належнай колькасьці польскіх палітасьветработнікаў для правядзеньня штодзённай сыстэматычнай работы сярод польскага насельніцтва.

Бюро ЦК КП(б)Б прапанавала Наркамасьветы **«забясьпечыць Хойніцкі раён адпаведнымі нацкадрамі для культработы», але НКА гэтага паказаньня Бюро ЦК яшчэ ня выканаў.**

Перад Хойніцкай партарганізацыяй яшчэ стаіць рад неадкладных задач.

У самы кароткі тэрмін трэба скончыць праверку беларусізацыі, узмацніць інтэрнацыянальнае выхаваньне рабочых заводаў і саўгасаў, калгаснікаў, узьняць на належную вышыню палітасьветную работу сярод нацменшасьцяй.

Трэба арганізаваць больш плянавую і сыстэматычную работу з беднатой і жанчынамі ў нацсаветах і вёсках, яшчэ больш разгарнуць калектывізацыю нацвёсак, ажывіць работу ўсіх грамадзкіх арганізацый і асабліва сэкцый сельсаветаў.

Нацкамісія пры РВК павінна зараз-жа заняцца дэталёвым вывучэньнем нацскладу насельніцтва, асабліва тых сельсаветаў, якія далучаны да Хойніцкага раёну з былога Юраўцкага з тым, каб там наладзіць належнае абслугоўваньне нацменшасьцяй на іх родным мове.

Хойніцкая партыйная арганізацыя не павінна спыніцца на дасягнутых посьпехах. Яна павінна і надалей весьці самую рашучую барацьбу за няўхільнае і сыстэматычнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі.

Вялікадзяржаўны шавініст

пад абаронай Наркампрацы

У месячніку праверкі беларусізацыі ў Гарадоцкім раёне было выяўлена, як раённы інспэктар працы т. Камоска разумее нац. палітыку. Калі яму паставілі пытаньне як ён разумее нац. палітыку нашай партыі, то ён адказаў, што гэта «ўсё чэпуха, бо украінцы гэта хахлы, гэта хахлацкая рэспубліка, а наконт беларусізацыі і слухаць не хачу».

Камісія пры праверцы падышла правільна ў адносінах т. Камоска, які адкрыта паказаў твар вялікадзяржаўнага шовініста, калі вынесла пастанову аб зьняцьці яго з працы з забаронай займаць адказныя пасады на працягу году.

Райвыканком замест зьнятага таварыша, са згоды райпрафсавету прызначыў другога таварыша, які ўпаўне адпавядае для работы ў якасьці райінспэктара працы, але работнікі наркампрацы, асабіста тав. Радзівонаў глядзіць інакш на гэту справу. Калі быў пасланы новы інспэктар працы для атрыманьня адпаведных дырэктыў дык работнікі Наркампрацы сустрэлі яго ў штыхі. «Вы ў нас ня лічаецеся нашым работнікам, а таму мы ня можам вам даць дырэктыў». Вось як адказалі новаму райінспэктару працы работнікі Наркампрацы.

Такім бюракратычным чыноўніцкім адносінам да справы павінен быць пакладзен канец.

М. І.

Пашыраць правы і абавязкі дэпутацкіх груп

Арганізацыя творчай ініцыятывы рабочае масы, узначаленае сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва забясьпечываюць завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялізму. Вось чаму ўся работа саветаў, ва ўсіх яе зьвяленьнях, павінна быць накіравана на захоп мас вакол двух кардынальных пытаньняў—выкананьня прамфінпляну і пасьпяховага скančэньня калектывізацыі і ліквідацыі на яе аснове кулацтва як клясы.

У адпаведнасьці з гэтымі задачамі павінны быць перабудаваны ўсе органы саветаў, асабліва яго масавыя органы—сэкцыі і дэпутацкія групы. Гэтыя органы павінны зьяўляцца сапраўднымі арганізатарамі мас вакол канкрэтнай дзейнасьці па выкананьні сёньняшніх задач сацбудаўніцтва.

Сучасныя мэтады працы сэкцый не забясьпечваюць яшчэ выкананьня гэтай задачы. У гэтым артыкуле мы хочам падкрэсьліць некаторыя дасягненьні ў масавай рабоце саветаў, паказаць недахопы ў перабудове сэкцый і намеціць некаторыя мерапрыемствы, якія, на нашай думцы, павінны дапамагчы перабудове работы саветаў.

У апошні час мы дамагліся (Віцебскі гарсавет) вызначэньня для сэкцый асобнага савецкага дня. Да сыстэматычнай работы ў сэкцыях уцягнено больш 200 рабочых і іх жонак, пры дапамозе якіх пазыка «3-ці рашаючы» была распаўсюджана на 120 проц. пляну. У часе веснавой сяўбы 100 членаў савету выехалі ў вёску, дзе прабылі больш двух месяцаў. Дзякуючы іх рабоце процант калектывізацыі вырас з 9 на 1-III да 72 на 15-IX-31 г. Дзякуючы звароту сельска-гаспадарчай сэкцыі да рабочых заводу «Камінтэрн», своячасова была зроблена помпа для аборы саўгасу «Білева». Брыгада каапсэкцыі адшукала склады на 3.000 тон гарадніны, камунальная сэкцыя знайшла плошчу на 500 кватэр для рабочых і г. д.

Але ці окаўсталі сэкцыі ўсе магчымасьці для выкананьня пастаўленых перад імі задач? Далёка не. Паказаць хоць-бы на ганебны прарыў у справе выкананьня прамфінпляну (85,6 проц. за першае паўгодзьдзе), на марудныя тэмпы арганізацыйна-гаспадарчага ўзмацненьня калгасаў, не заканчаны перавод іх на зьдзельнічыну, нездавальняючую работу ў сацыяльна-культурных установах (сталоўкі, лазьні і г. д.) Усё гэта паказвае, што сэкцыі ня ўсё зрабілі, што можна і патрэбна зрабіць, што яны толькі пачалі разгортваць работу.

І нажаль, у апошнія часы мы маем паслабленьне работы сэкцый, зрывы пленумаў сэкцый, адмаўленьне асобных членаў ад выкананьня даручэнняў ім работы, апартуністычныя разважаньні некаторых членаў сэкцый і г. д.

Галоўная прычына недастатковай работы сэкцый і яе паслабленьня ў апошнія часы знаходзіцца, па-мойму ў тым, што лёзунг тав. Сталіна—«У новых умовах трэба кіраваць па-новаму»—не знайшоў ажыцьцяўленьня ў рабоце сэкцый. Сэкцыі кіруюць «наогул». Прыкладам: пасылае сэкцыя свайго прадстаўніка вывяіць прычыны прарыву на мэталюргічным заводзе. Гэты прадстаўнік ня ведае вытворчасьці, а мае толькі агульную ўстаноўку. Зразумелая рэч, што прычын прарыву ён ня знойдзе і ўсякі эфэкт ад яго пасылкі трацілца.

Другой прычынай зьяўляецца тое, што гарсавет дае сэкцыям толькі сьледчыя справы, а не апэрацыйныя, што зусім не адпавядае ўзросшай актыўнасьці членаў сэкцый і затрымлівае рост іх ініцыятывы. Трэцяя прычына заключаецца ў тым, што работа сэкцый адарвана ад работы адпаведнага аддзелу і прэзыдыуму гарсавету. Сэкцыі і прэзыдыум працуюць па розных плянах. Часта прэзыдыум заслухоўвае пытаньні, якія ня былі раней распрацаваны на сэкцыі. Загадчыкі аддзелаў не нясуць ніякай адказнасьці за непрыцягненьне сэкцый для папярэдняга абмеркаваньня мерапрыемстваў, якія аддзел праводзіць.

Якія мерапрыемствы павінны быць ужыты для перабудовы работы сэкцый?

1. Сэкцыі павінны разьбіцца на галінныя брыгады, напрыклад, сэкцыя прамысловая на брыгады: па мэталюргіі, па скурана-абутковай прамысловасьці, па дрэваапрацоўчай прамысловасьці і г. д.; сэкцыя камунальная—на трамвайную брыгаду, брыгаду па электрасеці, брыгаду па водазабясьпечаньні і г. д. Да кожнай брыгады павінны быць прымацаваны толькі тыя члены сэкцыі, якія зьвязаны з тэй работай, якую будзе абслугоўваць брыгада. Кожная брыгада і кожны член брыгады павінен быць прымацаваны да канкрэтнага месца работы (трамвайны парк, асобныя трамваі і г. д.). Пленумы сэкцый павінны быць даведзены да мінімуму, а ўвесь цэнтр цяжару работы павінен быць перанесены ў брыгаду, якая мае на чале старэйшага брыгадзіра і працуе самастойна, а брыгадзір адказвае за работу брыгады перад бюро сэкцыі.

2. Сэкцыям павінны быць перададзены ня толькі кантрольныя, але і апэрацыйныя функцыі. Скажам, маецца якая-небудзь ненармальнасьць у тэй ці іншай сталовай. Калі пытаньне аб зьнішчэньні гэтай ненармальнасьці ня мае прынцыповага значэньня, дык яго можа вырашыць член савету, член сэкцыі. Трэба дамагчыся, каб гэтае вырашэньне было абавязковым для кіраўніка ўстановы. І толькі прынцыповыя пытаньні разьвязваюцца па інфармацыі брыгады на бюро сэкцыі, прычым гэтае рашэньне бюро павінна быць канчатковым, калі кіраўнік установы, або прадпрыемства ня супярэчыць на працягу 3-х дзён.

Гэтае мерапрыемства адаволіць узросшую актыўнасьць членаў сэкцый і ўзьніме іх аўтарытэт.

3. Неабходна цесна ўвязаць работу сэкцый з работай адпаведных аддзелаў і прэзыдыуму гарсавету. Павінен быць адзіны плян работы, бо гэта толькі дасьць магчымасьць усякае пытаньне спачатку прапрацоўваць на сэкцыі. Неабходна некаторых старшынь сэкцый увесьці ў склад прэзыдыуму гарсавету, абавязаўшы ўсіх старшынь сэкцый наведваць у вольны ад работы час паседженьні прэзыдыуму гарсавету. Трэба правесьці, як вопыт, сумяшчэньне так, каб загадчык аддзелу зьяўляўся адначасова і старш

ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКІ—НА ЎДАРНЫЯ ТЭМПЫ

Малацьба не разгорнута. Зьнішчыць „чарговасьць“ у рабоце, арганізаваць бесьперапынны абмалот і здачу збожжа дзяржаве

Збожжазагатоўкі—на ўдарныя тэмпы

Збожжазагатоўкі зьяўляюцца аднэй з адказьнейшых палітычна-гаспадарчых кампаній на вёсцы. Аднак, ня гледзячы на гэта да апошняга часу збожжазагатоўкі ня сталі яшчэ ў цэнтры ўвагі загатоўчых арганізацый.

Паводле пляну, на 1-е кастрычніка гадавое заданьне збожжазагатовак на БССР павінна быць выканана на 50 проц., а фактычна выканана толькі на 24,9 проц. (калгасы 22,4 проц., адпасобны сэктар—26,9 проц.).

Раённыя арганізацыі і сельсаветы праяўляюць недаацэнку збожжазагатовак. Малацьба збожжа затрымліваецца, рад калгасаў адкладваюць малацьбу на зіму, калі будуць скончаны ўсе палявыя работы.

Райкалгасасаюзы павінны павесьці рашучую барацьбу з падобнай чарговасьцю работы, неабходна дабіцца, каб абмалот і здача збожжа праводзілася нясупынна, забясьпечваючы выкананьне календарных плянаў загатовак.

Накаторыя раёны праявілі апартуністычную недаацэнку збожжазагатовак. **Асіпавіцкі** раён выканаў плян ледзь на 6,2 проц., **Крычаўскі**—3,6 проц., **Петрыкаскі**—6,6 проц., **Тураўскі** — 8,3 проц. **Чэрвеньскі—8,2 процанты.**

Збожжазагатоўкі ў гэтых раёнах праходзяць самацёкам, масы не мабілізаваны, загатоўчы апарат бязьдзейнічае, парт. ячэйкі і сельсаветы не праяўляюць актыўнасьці.

У тых раёнах, дзе вакол збожжазагатовак разгорнута масавасьць, мы маем высока-якасныя паказьнікі. Так, напрыклад, **Гомельскі** раён выканаў плян на 110,7 проц., **Горацкі**—61,4 проц.

Недапушчальна дрэнна пастаўлена справа спагнаньня цьвёрдых заданьняў па збожжазагатоўках з кулацка-заможных гаспадарак. Наркамснаб не дабіўся належнай арганізацыі вучоту спагнаньня цьвёрдых заданьняў. Пакуль што атрыманы зьвесткі з 28 раёнаў. Паводле гэтых вестак, плян па цьвёрдых заданьнях выканан ледзь на 18 проц. **Быхаўскі** раён выканаў на 13 проц., **Прапойскі**—5,5 проц., **Пукавіцкі**—16 проц. Гэтыя лічбы сыгналізуюць аб тым, што на мясцох цацкаюцца яшчэ з кулаком.

Трэба рашуча пакончыць з недаацэнкай збожжазагатовак. Вакол гэтай кампаніі неабходна мабілізаваць шырокія масы калгасьнікаў, рабочых саўгасаў, беднякоў і сераднякоў аднасобнікаў. Малацьбу збожжа трэба неадкладаць на зіму, а праводзіць зараз-жа.

Адначасова з гэтым трэба прымусіць кулака выканаць цьвёрдыя заданьні.

Пляны збожжазагатовак павінны быць выкананы поўнасьцю і ў тэрмін.

К. І.

Ударыць па настроях самацёку

ВІЦЕБСКІ раён выканаў плян збожжазагатовак на 1-га кастрычніка толькі на 25,7 проц., замест вызначаных 50 проц.

МАШКАНСКІ сельсавет выканаў гадавое заданьне на 4,4 проц.. **Замастоцкі** сельсавет 9,9 проц пляну. Ня лепш абстаіць справа і па іншых сельсаветах: **Рудніцкі** выканаў заданьне на 6,3 проц., **Бабініцкі** на 16,4, і толькі **Вінебскі** сельсавет выканаў гадавы плян на 84,2 проц., **В.-Летчанскі**—51,2 проц.

Ня гледзячы на зрыў збожжазагатовак Гарсавет і Райзаг ня ўжываюць належных захадаў, каб дабіцца пералому ў збожжазагатоўках.

Асноўная маса збожжа павінна паступіць ад калгасаў. Між тым калгасы выканалі гадавы плян толькі на 18,4 проц. Калгасы Машанскага сельсавету выканалі плян толькі на 0,3 проц., **Замастоцкага**—8,4 проц., **Рудніцкага**—6,5 проц.

У тых сельсаветах, дзе вакол збожжазагатовак мабілізавана думка калгасных мас, пляны выкананы з перавышэньнем (калгасы Віцебскага, В.-Лётчанскага сельсаветаў).

У радзе сельсаветаў цацкаюцца з кулаком, цьвёрдыя заданьні ня выконваюцца. Па Машканскім сельсавеце кулацка-заможная частка вёскі выканала заданьне на 5,7 проц., у Бабініцкім—на 5,3 проц.

Для выкананьня плянаў збожжазагатовак у Віцебскім раёне ёсьць усе магчымасьці, аб гэтым сьведчаць прыклады перадавых сельсаветаў.

Неабходна рашуча ўдарыць па настроях самацёку.—

О. Шульман.

Прымусіць кулака здаць збожжа

МАГІЛЕЎ (наш кар.). Загатоўчыя арганізацыі, рад сельсаветаў, парт'ячэек, праўленьні калгасаў да гэтага часу не ўявілі палітычнай важнасьці своячасовага выкананьня збожжазагатовак, не ўзьнялі гэтай кампаніі на палітычную вышыню, ня здолелі мабілізаваць калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы на ўпчыльненьне тэрмінаў загатовак, на рашучую барацьбу з кулацтвам і яго агентурай.

На 1 кастрычніка плян збожжазагатовак па раёне выкананы ледзь на 24 проц.

Дасовіцкі сельсавет выканаў плян збожжазагатовак усяго на 0,41 проц., **Хрыпялеўскі**—3,8 проц., **Дабрасьневіцкі**—8 проц., **Бялевіцкі**—12,4 проц., **Бракаўскі**—14 проц.

Зусім нічога ня робіцца па спагнаньні цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак. Рад сельсаветаў (Дасовіцкі, Навасельскі і інш.) да гэтага часу не спагналі ніводнага кілё збожжа.

У перадавых сельсаветах, дзе масы мабілізаваны — збожжазагатоўкі праходзяць пасьпяхова. **Мастоцкі** сельсавет выканаў гадавое заданьне па збожжазагатоўках на 64 проц. **Вендараскі**—на 60,7 проц. **Цішоўскі**—59,8 проц.

Ал. Нёманскі.

Спасылаюцца на „аб'ектыўныя“ прычыны

СЛУЦАК. (Наш кар.). Збожжазагатоўкі па раёне ганебна адстаюць. Гадавы плян выканан толькі на 18,2 проц.

Зусім дрэнна ідуць збожжазагатоўкі па **Шышчыцкім** сельсавеце, які выканаў плян загатовак на 9,2 проц., **Серадзінкоўскі**—7 проц., **Беліцкі**—9,7 проц. і **Ісернскім**—6,9 проц., **Палікарпаўскім**—8,1 проц., **Кастрычнікаўскім**—8 проц. Гэтыя сельсаветы не пераключыліся на ўдарнае правядзеньне збожжазагатовак. Тут спасылаюцца на «аб'ектыўныя» прычыны: ідзе дождж, выбіраюць бульбу і г. д.

Дрэнна праходзіць спагнаньне цьвёрдых заданьняў. Сельсаветы ня прымаюць рашучых захадаў, каб прымусіць кулака выканаць пляны збожжазагатовак.

Да апошняга часу райвыканком і райкаапсаюз не пераключыліся на ўдарнае правядзеньне збожжазагатовак. Патрэбен карэнны пералом у справе пасьленьня збожжазагатовак на Случчыне.

А. Курдо.

План па збожжы павінен быць выкананы

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Значная частка сельсаветаў Бабруйшчыны запартуністычна адносіцца да правядзеньня збожжазагатовак. Ніякай арганізацыйнай работы з бядняцка-серадняцкімі масамі не вядзецца, не прымаюцца рашучыя меры да спагнаньня цьвёрдых заданьняў па збожжазагатоўках з кулацка-заможных гаспадарак.

Прыкладам такой правазапартуністычнай дзейнасьці зьяўляюцца: **Бапушоўскі, Восаўскі, Мальлеўскі і Падрэцкі** сельсаветы, якія ў верасьні рэзка паслабілі сваю работу. План збожжазагатовак па гэтых сельсаветах 2-х апошніх дэкад выканан толькі на 42 проц.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што сельскія саветы не вядуць сыстэматычнай работы па арганізацыі бесьперапыннага струменю збожжа.

Пасьпяхова спраўляюцца са збожжазагатоўкамі **Міхалеўскі, Хімаўскі, Бортнікаўскі, Капусьцінскі** сельсаветы, якія здолелі арганізаваць беднату і серадняцтва на выкананьне пляну збожжазагатовак.

Адстаючым сельсаветам трэба вучыцца ў перадавых, як змагацца за выкананьне плянаў збожжазагатовак. Пляны павінны быць ня толькі выкананы, але і перавыкананы.

Дамброўскі.

Бальшавіцкімі тэмпамі

За апошнія дні тэмпы збожжазагатовак па **Ўваравіцкім** раёне значна ўзмацніліся. Агульны плян збожжазагатовак па раёне выканан на 43 проц. **Боркаўскі** сельсавет выканаў плян збожжазагатовак на 83 проц., **Сталінскі**—48 проц., **Стара-Беліўскі**—51 проц.

Гэтымі днямі калгасьнікі і бядняцка-серадняцкія масы раёну арганізавалі чырвоныя абозы з хлебам на ст. Вуза і Буда-Кашалёўск. За адзін толькі дзень было здадзена на пункты 18 проц. гадавога пляну.

Гэтых посьпехаў перадавыя сельсаветы дабіліся дзякуючы мабілізацыі калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас вакол кампаніі збожжазагатовак.

Але побач з гэтым ёсьць і такія сельсаветы, якія зрываюць пляны збожжазагатовак. Напрыклад, **Пячэнскі** сельсавет выканаў плян загатовак на 0,4 проц.

Таксама нездавалыняюча пастаўлена справа па спагнаньні цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак. Гадавы плян па цьвёрдых заданьнях выканан толькі на 32 проц.

Казіміраў.

Кандыдаты на чорную дошку

На 1-га кастрычніка г. г. гадавы плян збожжазагатовак па лініі спажывецкай каапэрацыі БССР выканан ледзь на 31,6 проц. Раённыя арганізацыі і сельсаветы працягваюць недаацэньваць збожжазагатоўкі. Так, па **Вушацкім** раёне плян збожжазагатовак выканан толькі на 8,5 проц., **Чашніцкім**—13,2 проц. **Мсьціслаўскім**—16,1 проц., **Чавускім**—20,6 проц., **Лёзьнянскім**—20,6 проц., **Башанковіцкім**—20,9 проц., **Крупскім**—18,5 проц., **Лепельскім**—21,9 проц., **Менскім**—23,8 проц.

Але, там дзе вакол кампаніі збожжазагатовак мабілізавана грамадзкасьць—там дабіліся добрых паказьнікаў. **Гомельскі** раён выканаў плян збожжазагатовак на 110,7 проц., **Горацкі**—61,4 проц., **Асьвейскі**—50,2 проц., **Дубровеньскі**—45,1 проц., **Талачынскі** — 42,3 проц., **Шклоўскі**—42,3 проц.

Кандыдаты на чорную дошку павінны падвесьці сваю энэргію, каб ліквідаваць прарывы на фронце збожжазагатовак.

Ф. Залуцкі.

Больш увагі рабоце ТД-Авіяхіму на вёсцы

Слуцак (наш кор.). Райсавет Асоавіяхіму Слуцкага р-ну мае некаторыя дасягненьні ў сваёй працы, якая праводзілася ў час летняга перыяду.

Так ахоплена ўневайсковай падрыхтоўкай па 12 гадзінай праграме—327 асоб і праз лягеры—104 асобы. Райсавет таксама мае 4 хэмкаманды, якія праводзяць рэгулярна свае заняткі праз кожныя 5 дзён.

Але гэтыя дасягненьні зусім не забясьпечваюць тых запатрабаваньняў, якія зараз прад'яўляюцца Осоавіяхімарганізацыі і не гавораць за належную пастаноўку работы, бо гэтыя дасягненьні Райсавет Асоавіяхім мае толькі па горадзе. Што-ж да вясковых ячэек, то тут справа абстаіць дрэнна.

Райсаветам асоавіяхім амаль нічога ня зроблена па рабоце на вёсцы. Аб гэтым яскрава сьведчыць тое, што з усіх ячэек на вёсцы наладжана работа толькі ў 6-ці і то ў тых, якія знаходзяцца ў прыгарадных вёсках і калгасах.

Асабліва дрэнна пастаўлена работа ў **Грэскай, Папрашоўскай, Ліньковскай, Дагадзеўскай, Жукоўскай, Азерскай ячэек і ў калгасе «Чырвоная кветка».**

Гэтыя ячэйкі не даюць ніякіх вестак і да гэтага часу не прадставілі нават сьпісаў членаў ячэйкі.

Ўсё гэта бязумоўна атрымалася дзякуючы таму, што Райсавет усю увагу аддаў гораду, аб вёсцы ўздумаў толькі цяпер.

Поруч з недастатковай работай па замацаваньні ячэек неабходна адзначыць зусім слабую работу па арганізацыі новых ячэек.

За апошнія месяцы арганізавана 9 ячэек і то зусім слабыя.

Ячэйкі ёсьць у самай нязначнай колькасьці калгасаў раёну і нават ня ўсе сельсаветы маюць ячэйкі.

Гэты факт гаворыць аб тым, што некаторыя сельсветы не паставілі перад сабою пытаньня аб актыўным удзеле ў рабоце Осоавіяхіму, не мабілізавалі сябе на дапамогу, нават тармозяць разгортваньне гэтай работы, трымаючы ў шуфлядах па некалькі тыдняў кіруючыя паперы Райсавету на імя ячэек.

Зусім нішчага ўдзелу ня прымае ў рабоце асоавіяхіму Райпрафсавет, які ліквідацыі апошняго малаважнай і не заслугоўваючай увагі. Ён лічыць непатрэбным займацца «дробязямі».

Побач з бязьдзейнасьцю Райпрафсавету неабходна адзначыць і бязьдзейнасьць РК ЛКСМ, які даведаўся аб месцы знаходжэньні Райсавету асоавіяхіму толькі ў той час, калі прызвалі касьцюмы, якіх ён актыўна пачаў дамагацца.

Між іншым трэба сказаць, што РК ЛКСМ павінен цікавіцца справай Асоавіяхіму ў першую чаргу і даваць яму сваю дапамогу.

За ўвесь час раённая газэта **«Ленінскі Шлях»** таксама не ўдзяліла гэтаму пытаньню хаця-б некалькі радкоў. на сваіх старонках.

Як дасягненьне з боку Райсавету трэба адзначыць, тое, што Райсавет прыняў актыўны ўдзел у зьнішчэньні палявых шкоднікаў шляхам арганізацыі брыгад і высылкай іх у больш небясьпечныя месцы

Што-ж да падрыхтоўкі да зімовага перыяду, дык тут справа зусім ня рухаецца з месца.

Аб гэтым з вінаватай усьмешкай сказаў сам старшыня:

— Няма нічога.

Такога становішча не павінна быць. Райсавет, не застанаўляючыся на дасягненьнях, павінен зараз-жа скласьці плян зімовых работ, наладзіць сталую сувязь і жывое кіраўніцтва незавымі ячэйкамі, зрабіўшы асноўны ўпор на справу ваенізацыі.

Партыйныя, савецкія і грамадзкія арганізацыі павінны па бальшавіцкі дапамагчы ў наладжваньні гэтай работы.

Ал. К.



Магнітагорскі волат да XIV гадавіны Кастрычніка

Там, дзе два гады таму назад было пустое месца, зараз будуецца вялізарнейшы ня толькі ў СССР, але і ва ўсёй Эўропе мэталюргічны завод. Магнітагорскі волат адразу паставіў нашу краіну ў адзін рад з самымі развітымі індустрыяльнымі капіталістычнымі краінамі.

Пасьля поўнага пуску ў 1933 г. магнітагорскі завод будзе даваць 4 млн. тон чыгуну—столькі, сколькі дала ў 1929 г. уся мэталюргія такой індустрыяльнай краіны як Бэльгія

Доменныя печы гэтага сусьветнага волата будуюцца на апошнім слове тэхнікі і маюць вялізарную прадукцыйнасьць у 1.000 тон мэталю ў суткі. Да XIV гадавіны Кастрычніка на будаўніцтве Магнітагорскага волату заканчваецца мантаж другой домны.

Мантаж першай домны ў асноўным ужо закончаны. Ударнікі Магнітабуду, якія ня раз ужо паказалі высокія гераічныя ўзоры сапраўднай бальшавіцкай працы, напружваюць сілы, каб спаткаць Кастрычнікавае сьвята новымі буйнымі перамогамі.

Многія брыгады кладчыкаў, бетоншчыкаў, мантажнікаў перавыконваюць свой плян на 50 і нават на 100 проц. У барацьбу за хутчэйшы пуск першых двух домнаў уключыліся і жонкі рабочых і спэцыялістаў, якія стварылі баявыя ўдарныя брыгады.

Аб выкананьні фінпляну Беларускай ССР, Ніжня-Волскім краем і Заходняй вобласьцю

Пастанова Камісіі выкананьня пры СНК СССР

Заслухаўшы даклад старшыні СНК Беларускай ССР т. Галадзеда, старшыні Ніжня-Волскага крайвыканкому тав' Казлова, старшыні Аблвыканкому Заходняй вобласьці тав. Доўгага і садаклады прадстаўнікоў НК РСІ т. Крывога і НКФіну СССР тав. Генкіна аб ходзе выкананьня фінансавага пляну, Камісія выкананьня ўстанаўляе наступнае:

1. Выкананьне фінансавага пляну па Беларускай ССР і, асабліва, па Ніжня-Волскім краі і Заходняй вобласьці праходзіць неадавальняюча (галоўным чынам, за кошт недавыкананьня пляну накапленьняў прамысловасьці, недастатковага скарыстаньня наяўных тавараных рэсурсаў, зрыву па Ніжня-Волскім краі і Заходняй вобласьці мясцовых заготовак, слабай мабілізацыі сродкаў насельніцтва).

2. Камісія выкананьня асобна адзначае, што пры ўзмацненьні тэмпаў работы па выкананьні фінансавых заданьняў у III квартале, у прыватнасьці, па Беларускай рэспубліцы і пры датэрміновым выкананьні радам раёнаў кантрольна-фінансавых заданьняў (па БССР—Сіроцінскім; па Ніжня-Волскім краі—Нова-Нікалаеўскім, Сярэдзіна-Ахтубінскім і Міхайлаўскім; па Заходняй вобласьці—Пагарэлаўскім, Бранскім і Смаленскім прыгарадным раёнамі) плян мабілізацыі сродкаў ня выконваецца.

Мясцовымі організацыямі, у тым ліку фінансавымі, не аддавалася дастатковай увагі паступленьню плацежоў ад сельскага насельніцтва, з прычыны чаго выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў па вёсцы значна адстае ад гораду.

Асабліва слабая работа па паступленьні плацежоў па самаабкладаньні, акцыях Трактарацэнтру, машынных абавязацельствах, лішкавых узносах спажыўкаапэрацыі і па ўступных узносах у калгасы, а таксама па дзяржпазыках і ўкладах у ашчадкасы.

3. Камісія выкананьня зазначае на неабходнасьць усямернага ўзмацненьня работы па адзначных вучастках і у прыватнасьці, па зборы сельгаспадатку (Заходняя вобласьць), акладным страхаваньні, прампадатку, падаходным падаткам (Ніжня-Волскі край, Заходняя вобласьць) зваротце сельскагаспадарчых пазык (БССР, Заходняя вобласьць), зборы авансаў у сыстэме спажыўкаапэрацыі (Заходняя вобласьць).

Асабліва зварочваецца ўвага СНК БССР і выканкому Заходняй вобласьці на невыкананьне ва ўстаноўлены тэрмін заданьняў аб спагнаньні з кулацкай часткі вёскі сельгаспадатку.

4. Адзначаючы слабасьць работы ў справе мабілізацыі сродкаў насельніцтва з боку мясцовых органаў спажыўкаапэрацыі, прамкаапэрацыі, Трактарацэнтру, Хлебажыцэнтру, Рыбгасазбуту, Лёнацэнтру, Акц. Т-ва «Сельгаснабжэньне», прапануе СНК БССР, Ніжня-Волскаму і Заходняму аблвыканкому ўзяць іх работу ў галіне мабілізацыі сродкаў пад асобны нагляд.

5. Канстатуючы наяўнасьць у БССР выпадкаў выдаткаваньня сродкаў, адпускаемых на капітальнае будаўніцтва, не па простым прызначэньні (Белторф), направільную практыку некаторых аддзяленьняў Дзяржбанку (Аршанскае), пералічаючы на эксплёатацыйныя рахункі сумы, адпушчаныя на капітальнае будаўніцтва,—прапануе Саюзторфу і Дзяржбанку накласьці спагнаньне на вінаватых, устанавіўшы ў далейшым належны кантроль за тым, каб сумы, адпускаемыя на капітальнае будаўніцтва, выдаткаваліся па простым прызначэньні.

6. Лічыць неабходным працягнуць работу Камісіі выкананьня па праверцы выкананьня фінансавых плянаў іншымі саюзнымі рэспублікамі, краямі і вобласьцямі.

Старшыня Камісіі выкананьня
В. Молатаў (Скрабін).

Сакратар Камісіі выкананьня
І. Межлаўк.

Масква, Крэмль, 5 кастрычніка 1931 г.

Бабруйскае аддзяленьне Белсадгароднінны працуе самацёкам

БАБРУЙСК. 1-X. (Белта). З 24-га па 28-га верасьня Бабруйскім раёнам адгружана Ленінграду 36 вагонаў бульбы, 6 вагонаў капусты і 1 вагон памідораў.

Аддзяленьне Белсадгароднінны адгрузіла Ленінграду за час з 15-га па 28-га верасьня капусты 11 вагонаў, памідораў 3 вагоны, салёных гуркоў 2 вагоны і яблык 3. Да загатоўкі бульбы аддзяленьне да гэтага часу яшчэ не прыступіла. Белсадгароднінна недапушчала на дрэнна кіруе нізоўкай. Бабруйскае аддзяленьне яшчэ нават не атрымала ні пляну загатовак, ні нарадаў на адгрузку. З-за дрэннага кіраўніцтва аддзяленьне Белсадгароднінны працуе без пляну, самацёкам. Бульба Ленінграду адгружаецца бяз усякага нараду.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

Культпроп ЦК КП(б)Б выклікае на нараду ў ЦК (пакой № 16) 9. X—31 г. а 10-ай гадз. раніцы наступных тт. Гурскі (Галоўмастацтва); Бучукас (БДВ) Сенкевіч (Ун-т Літаратуры БАН), Каўмёнак (БРЦ) і Матусаў (БДКіно).

Залатухін.

8-га кастрычніка, роўна а 8 гадзіне, у доме Асьветы адбудзецца сход настаўнікаў «0» групы.

Яўка абавязкова.

8 кастрычніка а 7-й гадзіне увечары Бюро Скаргаў НКРСІ і Штаб лёгкай кавалерыі г. Менску склікае нараду старшынь груп «ЛК і актыву ў памяшканьні ЦКК—НКРСІ (Савецкая 55 першы паверх).

Яўка абавязкова пад адказнасьць сакратароў яч. КСМ.

9 кастрычніка а 7 гадзіне увечары Бюро Скаргаў НКРСІ Бел. склікае нараду рабочых засядацеляў Бюро скаргаў у памяшканьні ЦКК НКРСІ (Савецкая 55 першы паверх).

Яўка абавязкова пад адказнасьць старшынь фабзаўкомаў.

Аказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Усім спажыўцом нафтапрадуктаў:

Дзяржаўным гаспадарчым і каапэрацыйным установам У ПЯЦІДЗЕННЫ ТЭРМІН

належыць надаслаць ўпаўнаважанаму Кіраўніцтва Заходняга раёну Саюзнафты па БССР (гор. Менск, вул. Талстога 32,—Нафтаскід)

заяўкі на патрэбную колькасьць нафтапрадуктаў

(гарючае і змазачныя матэрыялы)

па нуманклятуры Саюзнафты з падзелам па кварталах

Установы, якія не падашлюць своечасова заявак, ня будуць уключаны ў пляны забясьпечаньня.

УВАГА: 1) Цэнтральныя ўстановы падсылаюць агульныя заяўкі па сваёй перыферыі.

УВАГА 2) Мясцовыя арганізацыі ў сваю чаргу прадстаўляюць сваю заяўку ў той нафтасклад Саюзнафты, які іх забясьпечвае

Упаўнаважаны кіраўніцтва Заходняга раёну саюзнафты па БССР ГАЙДУК.

СЭКТАР КАДРАЎ ОРУ

АРГАНІЗУЕ 6-ці МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ БУХГАЛЬТАРОЎ ДЛЯ СЫСТЭМЫ „БЕЛПЛОДГАРОДНІНА“

Па сканчэньні курсаў абавязаны працаваць 2 гады ў сыстэме „Белплодгароднінна“ на раёне (у горадзе або мястэчку)

Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй 100 руб. у месяц. Кватэрамі не забясьпечваюцца.

Заявы прымаюць ад рахункових працаўнікоў на ніжэй рахунковода з аднагадовым стажам да 20 кастрычніка г. г.

Да заяў дадаць на т. дакументы: аб сацыяльным становішчы, аб адукацыі, аб стажы і аб праве голасу.

Адрас: Менск, Савецкая 55 ад 10—12 гадз. дня.

КОШТ публікацыі аб згубе 1 дакуманту **1 р.**

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА — З 6 кастрычніка новы савецкі фільм вытворчасьці Межрабпомфільм. КАНЕЦ ДЗЕРАГІНА Звыш праграмы: „Горласьць трэцяга рашаючага“ у 2 частках

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — Мастацкі фільм ЛЕДЗЯНЫ ЛЁС Працуе з 12 гадз. дня

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ“ — Мастацкі фільм ГАРАДЫ І ГОДЫ Пачатак 1 сэансу а 2 гадз. дня

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ — Дуглас Фэрбенкс СЫН ЗОРА. Пачатак а 7, 8,45 і 10,30. Каса ад 5 г.

Друкарня імя Сталіна

даводзіць да ведама усіх устаноў і бібліятэк, што прымаюцца заказы на розныя пераплётныя работы

Адрас: Дом Працы ўваход з вул. Энгельса.

Радускі сельсавет, Жлобінскага раёну, выклікае гр. Чайкоўскага Паўлу П. па справе скасаваньня шлюбу з гр-кай Чайкоўскай Авдоцяй М. жых. в. Зьмеўкі Радускага с.-с.

Голацкі сельсавет, Сьмілавіцкага раёну выклікае гр-на Сочак Петра Андрэева па справе скасаваньня шлюбу з гр-кай Сочак Ганнай Апанасаўнай.

Нарсуд Брагінскага раёну, на падставе прысуду ад 13-V—31 г. па арт. 196-213 КК, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў старшыні Храковіцкага лёнагагатоўчых старшыні Краковіцкага калгасу імя Сталіна, Садчэнко Янку Міхасеву абвяшчае грамадзкае ганьба ваньне.

У Капыльскі Райзагс ад грамадзян хут. Шастакі, Ланцуцкага сельсавету, Капыльскага раёну Жукаў Станіслава і Язэпа Я. паступіла хадайніцтва аб зьмене іх прозьвішча «Жук» на прозьвішча «Жукоўскі».

Асоб, якія маюць пратэст супроць гэтага прозьвішча, просьба паведаміць Капыльскі Райзагс, паказаўшы імя, імя па бацьку, прозьвішча і месца жых.

Нарсуд Брагінскага раёну, на падставе прысуду ад 8-IV—31 г. па арт. 196-213 КК, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў Капусьціну Ізраілю Самуілаву абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне.

Гр-н Курачкін Тодар Герасімаў, які паходзіць з гр-н г. Клінцы Заходняй вобласьці і жыве ў г. Менску, нараджэньня 1906 году, зьмяняе прозьвішча Курачкін на прозьвішча Дняпроў.

Асоб, якія маюць пратэсты супроць зьмены прозьвішча, просьба паведаміць аб гэтым Менскі ЗАГС, паказаўшы свае прозьвішча, імя і месца жыцьця.

Гр-н Дубовік Лукаш, які паходзіць з гр-н вёскі Віляцэвіч і жыве ў вёс. Каханоўшчына, Падгайскага сельсавету, Менскага прыгараднага раёну, нараджэньня 1905 г., зьмяняе імя Лукаш на імя Аляксей. Асоб, якія маюць пратэсты супроць зьмены гэтага імя, просьба паведаміць Менскі ЗАГС паказаўшы свае прозьвішча, імя і месца жыцьця.

Гр-н Сыракваша Аляксандр Тодараў, які паходзіць з гр-н вёскі Сялібя, Сьвіслацкага раёну і жыве ў горадзе Менску, нараджэньня 1906 г., зьмяняе прозьвішча Сыракваша на прозьвішча Камісараў.

Асоб, якія маюць пратэсты супроць зьмены гэтага прозьвішча, просьба паведаміць Менскі ЗАГС, паказаўшы свае прозьвішча, імя і месца жыцьця.

Нарсуд [illegible] ад 28-VIII-31 г. [illegible] ганьбаваньне [illegible] Саюзнафты Царыку Васілю, [illegible] Вялілёў Мікіту Сергею, [illegible] Міхасеву абвяшчае грамадзкае ганьба ваньне.

Гр-н Рабакон Мікіта Касьянаў, які паходзіць з гр-н сяла Крачкоўка, Уманьскай акр. (Кіеўшчына) і жыве ў г. Менску, зьмяняе прозьвішча і імя Рабакон Мікіта на прозьвішча і імя Фурманаў Мікола.

Асоб, якія маюць пратэсты супроць зьмены прозьвішча і імя просьба паведаміць аб гэтым Менскі ЗАГС, паказаўшы свае прозьвішча, імя і месца жыцьця.

Нарсуд Асіпавіцкага раёну, на падставе прысуду ад 11 сакавіка г. г. па арт. 213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. м. Асіпавічы, Шырокаму Васілю Хведараву, за тое, што б. інспэктарам калгасу выдаў ордэр на заняцьце кватэры ў прыватным доме, ведаючы аб тым, што дом не канфіскаваны, і ў выніку чаго быў выселены дзьве законна пражываючых там сям'і.

Нарсуд Горацкага раёну, на падставе прысуду Нарсуду Дрысенскага раёну ад 12 студзеня г. г., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне былому старшыні Кішчыцкага сельсавету Краснаву Герасіму А. за нядбайныя адносіны да выяўленьня кулацкіх гаспадарак і ня дачу зьвестак на выяўленыя кулацкія гаспадаркі.

Яўр. Нарсуд г. Менску, на падставе прысуду ад 27-IV-31 г. па арт. 131 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне рабочаму ф-кі «Акцябр» Левіну Абраму Залманаву за тое, што ён без дазволу ўбраўся у пакой гр-на Гермеля.

Нарсуд Буда-Кашалёўскага раёну, на падставе прысуду ад 9-га сакавіка г. г. па арт. 196 а санкц. 213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне былому адказнаму сакратару Буда-Кашалёўскага сельсавету Лісейчыкаву А. К., за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Любаньскага раёну, на падставе прысуду ад 9 сакавіка г. г. за нядбайныя адносіны да працы, якія выразіліся ў непрымаваньні адпачынку грыбоў дефіцытнымі таварамі, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне інструктару Самаўскага спаж. т-ва Кацьвельсону Х. В.

ЗГУБЛЕНЫ:

Вайсковы білет Баравік, выд. Халопенічамі, квіт. 856-п.

Білет Саюзу будаўнікоў № 6-14726 Москова Н., квіт. 856-п.

Білет саюзу Мэдсанпрацы на імя Маковецкай, квіт. 856-п.

Кніжка ЗРК «Чырвоная Бярэзіна» Хадасевіча Т. М.

Пашпарт Ашурак Л., выд. Халявіцкім с.-с. Чарэйскім раёнам, кв. 856-п.

Вайсковы білет Высоцкага Н. П., выд. Капаткевіцкім РВК, квіт. 863-п.

Асабовая кніжка Зайцава М. Я., выд Жлобінскім РВК, квіт. 870-п.

Вайсковы білет Мазурэнка С. М., выд. Маяўрскім ваенкаматам у 1920 г., квіт. 871-п.

Каапэрацыйная кніжка № 1638 Седлуха А. выд. Азарыцкім Райсаюзам, квіт. 873-п.

Вайсковая кніжка нарадж. 1909 г. Каўшара М., квіт. 874-п.

Вайсковы білет Галада Е. Я., выд. Каралінскім РВК, квіт. 876-п.

Вайсковы білет Грынберга Ш. Ш., выд. Гразоўскім прызыўн. камісіі. нарадж. 1906 г., квіт. 877-п.

Вайсковая асабовая кніжка Паўлава І, выд. Клімавіцкім Вайсковым сталом, квіт. 878-п.

Сяброўскі білет РЗЛ, вайсковы білет квіт. на права палявання Лейчыка М. Я. выд. Пукавіцкім Саюзам палявнічых, квіт. 880-п.

Вайсковая кніжка Адзярыха А. Я., выд. Мазырскім Аюрваенкаматм, квіт. 881-п.

Квіт. за № 121 Макшука А. П., выд. Азарыцкім спаж. т-вам на суму 25 р. квіт. 882-п.

Пасьведчаньне аб сканчэньні 2-х гадовых агульна-адукацыйных курсаў па падрыхтоўцы ў ВНУ ў г. Пятрыкове ў 1924 г. на імя Рэвута Т. І., квіт. 883-п.

Украдзены дакументы на імя Нуркуса І. І. Партбілет за № 0415714, выд. палітаддзелам № аддз. кав, брыг., аса бовае пасьведчаньне, выд. авіа-парткомам 3-й ВШЛ і ЛН, адпускны білет. выд. 3-й ВШЛ і ЛН.

Вайсковая кніжка Шэўчук С. Ф., выд. Тураўскім РВК, квіт. 787-п.

Вайсковая кніжка Занкевіч З. С., выд. Тураўскім РВК, квіт. 787-п.

Украдзена пячатка Мюцкому Саюзу Саўгандальслужачых м. Улль лічыць несапраўдным з 11-IX-31 г.

Згублена гумавая пячатка, Махнавіцкага сельсавету, Мазырскага раёну. Лічыць несапраўднай.

Кніжка на каня № 1995 Жыдкава М. Х. гр. жыв. у в. Ляздешня, Дрысенскага р-ну, кв. 727.

Мэтрычны выпіс Панкевіч Г. А., выд. Менскім ЗАГСам, кв. 728.

Мэтрычны выпіс Праўды Л. С., выд. Бабруйскім ЗАГСам, кв. 729.

Пасьведчаньне аб сканчэньні Азарыцкай сямігодкі за № 53 Райхліна Л. М., кв. 730.

Білет Шнеерава С. В. члена ЦВК за № 238, кв. 731.

Пашпарт Кахаровіча М. С., выд. Менакрміліц., кв. 732.

Талён Кахановіча М. С., выд. Біржай Працы, кв. 733.

Саюзны білет Кахановіча М. С. выд. саюзам друкароў, кв. 734.

3 мэтрычныя выпісы Міхайлоўскіх Абрашы, Хаіма і Асі, выд. Менскім ЗАГСам, кв. 735.

Пасьведчаньне аб нягоднасьці да вайсковай службы Курбацкага І. А., выд. Быхаўскай прызыўнай камісіі, кв. 736.

Сяброўскі білет ЛКСМБ за № 130243 Капаевіча Я. П., выд. Аршанскім Акр. ЛКСМБ, кв. 737.

Сяброўскі білет № 14221 Пінчука П., выд. саюзам працасьветы, кв. 738.

Дыплём Гурэвіча М. Б., выд. у 1928 годзе Гомельскім Ўрэйскім Політэхнікумам, кв. 839.

Мэтрычны выпіс Пешкура Т. В., выд. Калодзішчанскім с.-сав., кв. 740.

Чырвонаармейская кніжка Тальянава П. Я., выд. Штабам № Камейнага палка, кв. 741.

Мэтрычны выпіс Юхновіча Н. М., выд. Менскім ЗАГСам, кв. 742.

Вучотна-воінская картка № 408 і вучотна-воінская картка, нарадж. 1898 г. на імя Забалоцкага А. Г., кв. 74[illegible]

Пенсійная кніжка № 78 Сейруна Д. І., выд. Наркамзабясп., кв. 744.

Мэтрычны выпіс Каратквіча Г. А, выд. Менскім ЗАГСам, кв. 745.

Пропуск на тэлефон № 902, Сапуна М. А., выд